№ 10 (656) 10 сакавіка 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Пяць плюсаў і пяць мінусаў Уладзіміра Някляева**

Старонка 3

**74 гадовы жодзінец прабег з бел-чырвона-белым сцягам у 23 марафонах**

Старонка 6



**«Містэрам свету» стане беларус?**

Старонка 6


У НУМАРЫ

**ІПэшнікам зноў дазволяць наймаць на працу не толькі сваякоў?**

Такую прапанову бізнэс-колаў падтрымлівае міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў. **Старонка 4.**

**«Заплаці МТС 290 тысяч і развядзі Life:) на мільёны!»**

Байнэт знайшоў схему атрымання шматтысячных ці нават мільённых бонусных грошай на рахунак ад аператара Life:). **Старонка 15.**

**«Рок-карона» ў «Без Білета», але шоу скралі Кулінковіч і Вайцюшкевіч**

«Не ведаю, хто там будзе выступаць потым, але разагравае іх «Ляпіс Трубяцкой» — «Рок-каранацыя-2009». Старонка 11.


**Ганьба куратніку. Байка**

...А куры дралі пёры з крыл<br>
і дасылалі скаргаў стосы —<br>
Ліса тапіла імі грыль<br>
і з іх круціла папяросы.

Старонка 6.

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Rammstein гуляў з агнём

і палівАў публіку пенай з бетонамяшалкі.




АНТОН МАТОЛЬКА




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Лукашэнка прадае цэнтр Мінска аманцам за бясцэнак

Участак каля вуліц Купалы і Багдановіча збылі па $153 за квадратны метр.

Візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў сонечны Аман аказаўся не толькі чарговай экскурсіяй дэпутатаў. Прадстаўнікі краіны прывезлі ў азіяцкую краіну прэзідэнцкі ўказ № 93 ад 1 сакавіка. Згодна з ім, Беларусь гатовая аддаць Аману зямельны ўчастак плошчай 65000 квадратных метраў за $10 мільёнаў. Для пабудовы гатэляў сярэдняга класу, да Чэмпіяната свету па хакеі 2014 года.

Зямля не абы-якая, а гістарычная — у самым цэнтры Мінска, паміж вуліц Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, а таксама Свіслачу. Шчыра кажучы, гэтыя самыя квадратныя метры і прадаваць было нельга — яны адносіліся да «зямель рэкрэацыйнага прызначэння». Таму ва ўказе так і ўдакладняецца:

«Зьняніць мяжу ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны ..., выключыўшы з яе зямельны ўчастак плошчай 2,6 га, уключыўшы гэты ўчастак у склад грамадскай зоны...» І толькі пасля гэтага прадаць. Ужо законна.

## Чорны і белы спісы

Зямля перадаецца ва ўласнасць Аману без правядзення аўкцыёну за $10 мільёнаў (квадратны метр — $153!). Мэта — будаўніцтва на працягу 6 гадоў шматфункцыянальнага комплексу, а таксама інжынернай і транспартнай інфраструктуры. Фінансаванне праекта ўскладзена на Дзяржаўны генеральны рэзервавы фонд Амана.

Інтарэсы аманскага боку прадстаўляе кампанія «Арол Пропертыз чатыры». У нагрузку яна атрымае шраг аб'ектаў.

Давядзецца захаваць размешчаныя на ўчастку будынкі найстарэйшага мінскага шпіталя, якія з'яўляюцца гістарычна-культурнай каштоўнасцю, а таксама Алею Дружбы. А вось у «чорны спіс» трапілі Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа» з прыбудовамі, 2-я гарадская клінічная бальніца і будынак РУП «Мінскэнэрга». Іх інвестару прыйдзецца зносіць за свой кошт.

На пераезд «БелЭкспа» і «Мінэнерга» выдзелены год. На бальніцу даецца паўтара. Дарэчы, яшчэ месяц таму мінскія ўлады заяўлялі, што вырашылі адмовіцца ад зносу бальніцы, бо ў дэфіцыце койкамесцы. Згад зверху зноў парушыў планы.

Толькі пасля таго, як будынкі афіцыйна згубяць уласніка, інвестар павінен будзе заплаціць $10 мільёнаў у бюджэт Мінска.

**Працяг на старонцы 4.**

# Звольнены старшыня Маскоўскага суда Мінска



Старшыня суда Маскоўскага раёна Мінска Анатоль Савіч згодна з указам Аляксандра Лукашэнкі звольнены з працы. У сталіцы ходзяць упартыя чуткі, што супраць былога старшыні суда распачата крымінальная справа па падазрэнні ў злоўжыванні службовым становішчам і хабарніцтве.

Афіцыйнага пацверджання гэтага пакуль што не атрымана.

На тэрыторыі Маскоўскага раёна знаходзіцца большасць міністэрстваў і ўпраўленняў.

Менавіта ў судзе Маскоўскага раёна вернікі царквы «Новае жыццё» дабіваліся адмены рашэння гарадскіх уладаў.

У Маскоўскім судзе разглядаліся гучныя справы, у тым ліку экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Аляксандра Казуліна.

Большасць затрыманых удзельнікаў вулічных акцый і лідэры палітычных партый падчас мінулай выбарчай кампаніі дастаўляліся ў Маскоўскі суд, дзе іх каралі на максімальныя тэрміны арышту.

Анатоль Савіч нарадзіўся ў 1959 годзе. Мае стаж працы суддзёй 16 гадоў. Пасаду старшыні суда заняў аж 10 гадоў таму.

У судзе Маскоўскага раёна працуе 97 чалавек, сярод іх 14 суддзяў і 21 судовы выканаўца.

**СГ; інф. радыё «Свабода»**

# Праслухоўванне на шырокую нагу




**Спецслужбы ўзаконілі свой доступ да базаў мабільных апаратараў.**

Указам прэзідэнта № 129 ад 3 сакавіка зацверджана палажэнне аб парадку ўзаемадзеяння апаратараў электрасувязі з органамі, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць (АВД).

Дакумент рэгламентуе парадак іх узаемадзеяння пры аператыўна-вышуковых мерапрыемствах, для забеспячэння доступу да баз звестак, інфармацыі пра абанентаў і пра аказаныя ім паслугі электрасувязі, а таксама да іншай інфармацыі, неабходнай для выканання задач спецслужбаў.

У палажэнні выкарыстоўваецца панятак «аддаленыя пункты кіравання сістэмамі тэхнічных сродкаў для забеспячэння аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў» (СЗВМ) — навуковая назва для праслухоўвальнай апаратуры. Такімі пунктамі з'яўляюцца аб'екты з апаратнымі і праграмнымі сродкамі для кіравання СЗВМ, што выкарыстоўваюцца органамі дзяржбяспекі і Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры прэзідэнце.

Цяпер пры пабудове сеткі электрасувязі аператар абавязаны выкарыстоўваць сродкі электрасувязі, якія дазваляюць забяспечыць укараненне СЗВМ, што прадугледжваюць незалежнае падключэнне аддаленых пунктаў кіравання СЗВМ органаў дзяржбяспекі і Аператыўна-аналітычнага цэнтра.

Дакумент рэгламентуе пытанні набыцця і эксплуатацыі бакамі неабходнага абсталявання. Так, напрыклад, ён абавязвае аператара за кошт уласных сродкаў набываць, устанаўліваць, абслугоўваць і рамантаваць СЗВМ, абараняць звесткі пра тактыку правядзення АВД, абмяжоўваць кола асоб, якія прыцягваюцца да ўстаноўкі, абслугоўвання і рамонту СЗВМ.

Паводле патрабавання органаў, аператар абавязаны даваць бясплатны кругласутачны аддалены доступ да баз звестак абанентаў.

**Паводле БелаПАН**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### 50 тамоў «Беларускага кнігазбору»

17 сакавіка ў мінскім Палацы мастацтваў (Казлова, 3) пройдзе святочная імпрэза, прысвечаная выхаду 50-га тома кніжнага праекта «Беларускі кнігазбор». Ініцыятыва стварэння «Кнігазбору» належыць пісьменніку Кастусю Цвірку. Ён загарэўся ідэяй выдаць у 200 тамах усё найлепшае з літаратуры, што было створана на беларускай зямлі. Першы том праекта, «Выбраныя творы» Яна Чачота, выйшаў у 1996 г. У вечарыне бяруць удзел акадэмік Радзім Гарэцкі, доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс, паэты Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Уладзімір Някляеў, старшыня МГА «Белкнігазбор» Кастусь Цвірка, дырэктар выдавецтва «Кнігазбор» Генадзь Вінярскі. Спяваюць Зміцер Вайцюшкевіч, Таццяна Беланогая. Рэй вядзе паэт Міхась Скобла. Пачатак а 18-й.

Будуць прэзентаваныя найноўшыя тамы збору.

## СЦІСЛА

### Польска-беларускія кансультацыі перанесеныя

Першае пасяджэнне беларуска-польскай камісіі па ўрэгуляванні канфлікту вакол Саюза палякаў Беларусі перанесенае на няпэўны тэрмін. Прычынай сталі рознагалоссі бакоў. Рашэнне стварыць камісію было прынята пасля сустрэчы Лукашэнкі і міністра замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага ў Кіеве.

### Жураўлевіч і Марфіцкі ўзнагароджаныя пасмяротна

Ордэнам «За асабістую мужнасць» пасмяротна ўзнагароджаныя палкоўнікі беларускага войска Аляксандр Жураўлевіч і Аляксандр Марфіцкі. 30 жніўня на авіяшоу ў горадзе Радам (Польшча) падчас выканання фігуры вышэйшага пілатажу іх Су-27 разбіўся. Лётчыкі адвялі самалёт ад горада і не катапультаваліся, цаной свайго жыцця ўратаваўшы людзей.

### Януковіч: Украінская будзе адзінай дзяржаўнай

Украінскі прэзідэнт Віктар Януковіч заявіў, што ўкраінская мова будзе адзінай дзяржаўнай мовай. Пры гэтым ён удакладніў, што ў краіне «ў абавязковым парадку будзе ўкаранёная Еўрапейская хартыя рэгіянальных моваў».

### Уначы мінус 15, удзень плюс 6

У сераду і чацвер па краіне чакаецца пераменная воблачнасць, без ападкаў. Толькі 12 сакавіка па паўднёвым усходзе невялікі снег. Месцамі туман. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература ноччу ад мінус 2 да мінус 13 пры праясненнях, днём мінус 1 — плюс 6°С.

**ЗП; БелаПАН, БЕЛТА**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў. З 1 красавіка ён вырасце да 7500 рублёў у сувязі з ростам рознічнай цаны.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

А.М., Сяргею А. з Полацкага раёна.
Лекадзіі Н. з Валожынскага раёна.
Міхаілу М., Фадзею К. са Стаўбцоўскага раёна.
Мікалаю В. з Бярозаўскага раёна.
В.П. з Бабруйскага раёна.
А.П. са Жлобінскага раёна.
Вользе Ж., Уладзіміру Я., В.Д. з Барысаўскага раёна.
Антаніне К. з Крупскага раёна.
Міхаілу Ш. з Клімавіцкага раёна.
Тамары К. са Смалявіцкага раёна.
Аксане Д., Аляксандру К. з Пінскага раёна.
Л.Р. з Калінкавіцкага раёна.
Валерыю Б., Віктару З., Ігару Д. з Брэста.
Т.В., Галіне Л. з Гродна.
Аляксандру Б., В.Г., А.Г. з Мінскага раёна.
Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёна.

# Пяць плюсаў і пяць мінусаў Уладзіміра Някляева

Паэт Уладзімір Някляеў заявіў аб старце грамадскай кампаніі «Гавары праўду». Падкрэсліваецца, што гэтая ініцыятыва непалітычная. Тым не менш, Уладзімір Някляеў прыцягвае разглядацца як патэнцыйны кандыдат у прэзідэнты. Якія моцныя і слабыя бакі гэтага кандыдата?

### 1. Здольны аб'яднаць

**+** Някляеў мае прыязныя адносіны з большасцю апазіцыйных палітыкаў. Ён ніколі не ганіў апазіцыю за бяздзейнасць, інертнасць, слабасць. Наадварот, гаварыў пра тое, што яна робіць усё, на што зараз здольная. У Някляева нармальныя стасункі з Мілінкевічам, Казуліным, Баршчэўскім. Нават з Пазняком яны пару гадоў назад сустракаліся ў Варшаве. Пры пэўных раскладах Някляеў мог бы стаць тым чалавекам, што аб'яднаў бы апазіцыю. Ягоная асоба не выклікае адчужэння як у нацыяналістаў, так і камуністаў.

**–** У Някляева няма самастойнага досведу ўдзелу ў палітыцы. Ён браў удзел у выбарчых кампаніях Уладзіміра Ганчарыка і Аляксандра Казуліна. (Заўважым, не Домаша і Мілінкевіча.) Тым не менш, заставаўся там на другіх ролях. Ролю першасную ў палітыцы Някляеў выконвае ўпершыню, таму памылкі будуць непазбежнымі. Зрэшты, ёсць досвед са сферы культуры. Нейкі час Някляеў узначальваў Саюз пісьменнікаў і ПЭН-Цэнтр.

### 2. Эмацыйнасць

**+** Па энергетыцы выступаў і эмацыйнасці знайсці роўнага Някляеву ў беларускай палітыцы будзе цяжка. Паэт ведае, як завабіць публіку, прымусіць яго слухаць, каб людзі глыталі кожнае ягонае слова. Калісьці ён вёў тэлеперадачу. А выступ на вулічнай акцыі для шматтысячнага натоўпу — гэта стыхія Някляева.

**–** Эмоцыі не заўсёды граюць станоўчую ролю. Някляеву не заўсёды хапае пачуцця тактоўнасці і вытрыманасці. Разам з тым, Някляеў мае цвёрды характар.

### 3. Грошы

**+** Калі Някляеў пойдзе ў прэзідэнты, ягоная кампанія будзе рабіцца на беларускія грошы. Дзяржаўныя СМІ не змогуць папікнуць кандыдата, што ён жыве за кошт заходніх грантаў.

**–** Разам з тым, усё яшчэ невядома, што ж за «нябедныя» людзі стаяць за Някляевым. Ёсць сумневы, што Уладзімір Пракопавіч сам выйшаў на гэтых фундатараў. Калі не ён, то хто? Казулін? Нехта з прадстаўнікоў наменклатуры?



УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

Някляеў пакуль не агучыў выразную палітычную пазіцыю. Ён за дыялог з уладай ці за санкцыі? За саюз з Расіяй ці за ўступленне ў Еўрасаюз?

### 4. З інтэлігенцыі

**+** Падтрымка інтэлігенцыі. За «Гавары праўду» падпісаліся вядомыя і аўтарытэтныя ў краіне людзі. Такія, як Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Зінаіда Бандарэнка. Падтрымка такіх асобаў адразу дадае Някляеву лішніх пунктаў. Інтэлігенцыя падтрымае паэта, чые вершы да гэтага часу ёсць у школьнай праграме.

**–** Разам з тым, разлічваць на актыўную падтрымку інтэлігенцыі Някляеў можа наўрад. Гэта хутчэй маральная сімвалічная дапамога. Сам Някляеў у нядаўнім інтэрв'ю «НН» гаварыў, што час удзелу інтэлігенцыі ў палітычнай барацьбе мінуў. Прэзідэнцкую ж кампанію робяць дасведчаныя актывісты і моладзь. Ці будзе моладзь працаваць на Някляева, сказаць цяжка.

### 5. Пазнавальнасць

**+** Пазнавальнасць. Вядомасць Някляева не меншая, чым у лідэраў апазіцыі. Доўга тлумачыць, хто такі Уладзімір Някляеў, выбарцам не давядзецца. «Гэта той, што «Сёння ў нашай хаце свята» напісаў», — можна ўспомніць яшчэ з дзясятак вершаў паэта, што сталі хітамі.

**–** Сумнеўнае мінулае. За Някляевым цягнецца хвост скандальнага мінулага. У 1999 годзе ён быў вымушаны з'ехаць з краіны. Гэта было звязана з ягоным канфліктам з унтэр-ідэолагам Замяталіным. Праз нейкі час паэт усё ж вярнуўся на Радзіму. Ніякіх наступстваў не было. Тым не менш, кампрамат на Някляева-кандыдата ў прэзідэнты можа быць знойдзены.

**Зміцер Панкавец**




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Андрэй Саннікаў ідзе на прэзідэнцкія выбары

**Каардынатар «Хартыі–97» Андрэй Саннікаў у гутарцы з карэспандэнтам «Нашай Нівы» пацвердзіў інфармацыю, што ён збіраецца вылучаць сваю кандыдатуру.**

Упершыню гэта Саннікаў агучыў 6 сакавіка ў Вільні падчас запісу на тэлеканале «Белсат» перадачы «Форум».

«Гаворка зайшла пра суверэнітэт, пра яго абарону. Я сказаў, што павінен быць чалавек, здольны ўзяць на сябе адказнасць за лёс краіны. Я сказаў, што буду ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. Эфір на тэлеканале «Белсат» падаўся мне зручным месцам для абвяшчэння такога рашэння», — кажа А.Саннікаў.

Пра падрабязнасці кампаніі Саннікаў не паведамляе, але не выключае, што бліжэйшым часам можа быць скліканая прэс-канферэнцыя, дзе будзе заяўлена аб пачатку кампаніі.

«Ёсць людзі, якія мяне падтрымліваюць, але я пакуль не магу называць іхнія імёны, каб у іх не было праблем», — гаворыць палітык.

Раней аб удзеле ў прэзідэнцкай кампаніі заявіў Алесь Міхалевіч. Выбары павінны адбыцца ў пачатку наступнага года.

**ЗП**

**Андрэй Саннікаў**

Нар. у Мінску ў 1954. Скончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. У 1982—1985 працаваў у Сакратарыяце ААН у Нью–Ёрку. Пасля сканчэння Маскоўскай дыпламатычнай акадэміі ў 1989 — у Міністэрстве замежных справаў Беларусі. Ад 1993 да 1995 быў дарадцам місіі Беларусі ў Жэневе. У 1995 прызначаны намеснікам міністра замежных справаў Беларусі. З лістапада 1996 стаў міжнародным каардынатарам грамадскай ініцыятывы «Хартыя–97». Мае дыпламатычны ранг пасла. Жанаты, мае сына.

## Лукашэнка пакуль не адказаў на запрашэнне Грыбаўскайце

Пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас пацвердзіў, што канцылярыя прэзідэнта Далі Грыбаўскайце накіравала Аляксандру Лукашэнку запрашэнне на святкаванне 20-годдзя аднаўлення незалежнасці Літвы, што адбудзецца 11 сакавіка ў Вільні.

Лукашэнка яшчэ не даў адказ, ці збіраецца прысутнічаць на ўрачыстасцях. У Вільні збяруцца кіраўнікі многіх дзяржаваў нашага рэгіёна.

Эдмінас Багдонас зазначыў, што для Літвы дзень 11 сакавіка вельмі важны. «Я ганарыся тым, што было зроблена 20 гадоў таму», — зазначыў пасол. Што датычыць выдачы генерала Усхопчыка, дыпламат пазітыўна ацаніў вынікі супрацоўніцтва паміж генеральнымі пракуратурамі Літвы і Беларусі. «Няма самога жадання факта пакарання. Важна проста дамовіцца», — зазначыў дыпламат.

У верасні Лукашэнка наведваў Вільню з афіцыйным візітам. Гэта была першая паездка кіраўніка Беларусі ў краіну Еўрасаюза пасля доўга перыяду візавых санкцый.

**ЗП**

## Арыштаваная пракурорка Святлана Байкова

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі старшага следчага па асабліва важных справах Генпракуратуры Святлану Байкову. Яна была адзінай жанчынай-пракурорам, якая працавала на роўных з мужчынамі.

Святлана Байкова займалася расследаваннем справы былога начальніка Дэпартамента фінансавых расследаванняў Анатоля Грамовіча. Яна вяла гучную справу мытнікаў з «Заходняга Буга». Нейкі час Байкова расследавала знікненне Юрыя Захаранкі.

У пракуратуры ў Байковай была крыштальна чыстая рэпутацыя. Як напісаў «Ежедневник»: «Калі б нават пасадзілі самога генпракурора, то шумелі б меней».



**Святлана Байкова**

Нар. у 1968 у Мінску. Скончыла юрыдычны факультэт БДУ. Працавала ў пракуратурах Верхнядзвінскага раёна і Ленінскага раёна Мінска. Спецыялізацыя — расследаванне крымінальных справаў па артыкуле «Бандытызм». У верасні 2010 года збіралася сысці на пенсію.

Паводле крыніц сайта naviny.by, апошнім часам Святлана Байкова адчувала, што яе чакаюць непрыемнасці. Яна шукала сустрэчы з былым генпракурорам і кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Віктарам Шэйманам. Выглядае, што нават па адстаўцы Шэйман працягвае з'яўляцца адным з найбольш уплывовых людзей у атачэнні Лукашэнкі.

Незадоўга да арышту КДБ пачало праверку чатырох апошніх справаў Байковай, у тым ліку Грамовіча. Байкова пратэставала супраць умяшання ў ход расследавання, але ёй сказалі, што камісія створаная на загад Лукашэнкі.

Відавочна, арышт Байковай — яшчэ адзін акт у супрацьстаянні дзяржаўных спецслужб.

**ЗП**

### СЦІСЛА

**2,86% вылучаных ва ўчастковыя камісіі — прадстаўнікі партый**

У склад 6387 участковых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў мясцовых саветаў вылучаны 77 241 чалавек. З палітычных партый больш за ўсё сваіх прадстаўнікоў у склад участковых камісій вылучыла праўладная Камуністычная партыя — 516 чалавек. Аб'яднаная грамадзянская партыя вылучыла 281 чалавека, Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» — 160, Партыя БНФ — 122, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) — 24, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада — 9, Кансерватыўна-хрысціянская партыя — БНФ — 8. Выбары дэпутатаў мясцовых саветаў пройдуць 25 красавіка.

**Нацболы перайшлі ў апазіцыю**

У распаўсюджанай нацыянал-бальшавікамі заяве, якая называецца «Да пабачэння, бацька», сказана: «Абапіраецца Лукашэнка выключна на сілавыя структуры, на КДБ і МУС. У краіне не існуе палітыкі, яна знішчана гвалтоўна, зверху, яго уладай, таксама як знішчана палітыка ў Расіі і ў большасці рэспублік былой савецкай прасторы».

**ЗП**

# Лукашэнка прадае цэнтр Мінска аманцам за бясцэнак

Працяг са старонкі 1.

### Зніжкі для беднага Амана

Каб палегчыць жыццё аманскаму інвестару, Беларусь хоча даць яму падатковыя і мытныя льготы. Праект будаўніцтва пастараюцца ўключыць у спецыяльны льготны спіс праектаў, які складаўся Камісіяй мытнага саюза, для вызвалення ад выплаты мытаў падчас увозу абсталявання, будаўнічых матэрыялаў і іншых тавараў у рамках рэалізацыі праекта. У дадатак, аманцы атрымаюць права без абмежаванняў ажыццяўляць продаж пабудаваных кватэраў ва ўласнасць беларускім і замежным рэзідэнтам.

З папярэдніх размоў зразумела, што аманцы як быццам бы мусяць пабудаваць пяцізоркавы гатэль, офісныя будынкі і жылыя дамы.

Праўда, пра штосьці канкрэтнае пакуль што казаць рана. Беларусы разлічвалі, што гатэль на гэтым месцы зможа прыняць пастаяльцаў ужо ў 2014 годзе, калі адбудзецца чэмпіянат свету па хакеі. Але, як заўважаюць у Камітэце архітэктуры Мінгарвыканкама, пакуль што няма нават праекта будаўніцтва.

### Выставы сашлюць за кальцавую?

Як вядома, у склад «Белэкспа» ўваходзіць павільён з кніжным кірмашом. На параўнальна танныя цэны сцякаюцца кнігалюбы з усяго горада. Куды ім прыйдзецца ездзіць пасля мяркуемага пераносу выставачнага цэнтра?

Дакладнага адказу на пытанне няма, але яшчэ ў снежні дырэктар «Белэкспа» Аляксей Лазука расказваў пра пошук інвестараў для будаўніцтва комплексу каля Шчомыслiцы — вёскі за межамі Мінска, каля філіяла БДУ і непадалёк ад раёна Курасоўшчына. Шлях туды з цэнтра горада на аўтобусе займае каля 45 хвілін.

Ці будзе там працаваць кніжны кірмаш? Аляксей Лазука кажа, што не ведае: «У каго гандляры захочуць здымаць памяшканні — іх пытанні». Можа, знойдуць сабе нейкае іншае месца.

Які настрой пануе сярод прадаўцоў кірмашу? Кніжны распаўсюднік Алесь Мазанік кажа, што за гады працы прывык да чутак: «Ніхто не панікуе. Як мінімум да канца года мы маем заключаныя кантракты». Па ягонай інфармацыі, на аманскую кампанію «павесілі» яшчэ будаўніцтва новай бальніцы і новага «Белэкспа». «Кажуць, што мы больш хацелі прадаць зямлю, чым Аман — купіць», — расказвае ён.

Многія выказваюць меркаванне, што азіяты купілі зямлю для перапродажу. Як паказвае вопыт суседніх краін, зямля ў гістарычным цэнтры сталіцы, ды яшчэ каля ракі, можа каштаваць да $5 тысяч за квадратны метр — $325 мільёнаў за ўсю тэрыторыю. Пры ўкладзеных $10 мільёнах, нават пры ўмове пабудовы бальніцы ўзамен, — надзвычай выгаднае для Амана рашэнне.

**Ягор Марціновіч**



«Белэкспа» пойдзе пад знос.

PHOTO.BYMEDIA.NET

**Як паказвае вопыт суседніх краін, зямля ў гістарычным цэнтры сталіцы можа каштаваць да $5 тысяч за квадратны метр.**



## ІПэшнікам зноў дазволяць наймаць на працу не толькі сваякоў?

**Такую прапанову бізнэс-колаў падтрымлівае міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў.**

Старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір Карагін, які ўваходзіць у склад грамадскай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта, мяркуе, што ўжо ў найбліжэйшы час будуць прынятыя змены ва ўмовах працы індывідуальных прадпрымальнікаў.

Галоўнае нававвядзенне — прадпрымальнікам дазволяць наймаць на працу не толькі сваякоў, але і іншых грамадзян. Такое права было адабрана ў іх у пачатку 2008 года, што стала прычынай шматтысячных акцый пратэсту. Дэманстранты двойчы перакрывалі рух у цэнтры Мінска, а тагачасны міністр унутраных спраў Навумаў асабіста кіраваў разгонам акцый, у выніку якіх з'явілася 14 палітвязняў.

Уладзімір Карагін кажа, што з такой прапановай да ўладаў звярнуліся ўсе бізнэс-структуры краіны, і міністр эканомікі падтрымаў ідэю. Цяпер чакаецца толькі рэзалюцыя кіраўніка дзяржавы.

Апроч таго, мяркуецца ўвядзенне падатковых зніжак для індывідуальных прадпрымальнікаў.

**ЯМ**

## Германія параіла Грэцыі прадаць астравы

**Грэкі ў адказ запатрабавалі кампенсацыю за вайну.**

Нямецкія дэпутаты знайшлі арыгінальны спосаб дапамагчы Грэцыі, якая не можа выбрацца з глыбокага фінансавага крызісу. Берлін прапануе Афінам скінуць баласт у выглядзе некалькіх выспаў і тым самым скараціць дэфіцыт бюджэту. Маўляў, гэта добрая альтэрнатыва, каб не звяртацца па дапамогу ў астатнія краіны Еўрасаюза. Германія як адна з самых магутных эканомік Еўропы не хоча ўдзельнічаць у аперацыі па «выратаванні» Грэцыі.

Афіцыйны прадстаўнік грэцкага міністэрства замежных спраў заявіў, што такое абсурднае пытанне кіраўніцтвам краіны не разглядаецца. У гэты ж час у краіне зноў сталі з'яўляцца выказванні, што Германія мусіць выплаціць кампенсацыю за гады нацысцкай акупацыі. У Грэцыі даволі распаўсюджанае меркаванне, што іх краіну абмінулі пры выкананні пасляваенных абавязацельстваў.

Пасля ўзнятага вэрхалу нямецкія дэпутаты заявілі, што іх прапанова была проста спробай пачаць дыскусію пра тое, як Грэцыя можа дапамагчы сабе.

**ЯМ**

## Казка пра адзіную валюту

**Першы віцэ-прэм'ер Расіі Ігар Шувалаў узнавіў размовы пра пераход на адзіную валюту.**

Цяпер размова вядзецца не толькі пра Расію і Беларусь, а адразу пра Мытны саюз. Падчас выступлення на міжнародным эканамічным форуме дзяржаў-удзельніц СНД чыноўнік нагадаў, што да 2012 года плануецца стварыць адзіную эканамічную прастору. «Я не стаў бы выключаць пераход у перспектыве тут да адзінай валютнай прасторы», — удакладніў ён.

Варта нагадаць, што першай меркаванай датай увядзення адзінай валюты называлася 1 студзеня 2004 года. Планы былі перасунутыя на год, пасля яшчэ на год... Да гэтага часу адзіным «веснікам» адзінай валюты заставаўся дзяржсакратар саюза Беларусі і Расіі. У кожным інтэрв'ю ён падкрэслівае, што да ўвядзення супольных грошай засталося год-два. Цяпер яго ініцыятыва падтрыманая на больш высокім узроўні.

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Дапамогуць на ўсе сто

У краіне павялічаны памер ільготнага крэдыту на будаўніцтва жылля. Шматдзетныя сем'і змогуць атрымаць усе 100% максімальнага памеру крэдыту, што выдзяляецца на будаўніцтва жылля (раней было 90%), а іншыя грамадзяне — 90% (замест 70%). У населеных пунктах, дзе пражывае менш за 20 тысяч чалавек, стаўка льготнага крэдыту будзе зменшаная з 3% да 1% гадавых.

### МВФ вяртаецца ва Украіну

Міжнародны валютны фонд гатовы працягнуць працу з Украінай. Пра гэта дырэктар МВФ сказаў у тэлефоннай размове новаму прэзідэнту Украіны Віктару Януковічу. МВФ яшчэ ў 2008 годзе пагадзіўся прадаставіць Украіне антыкрызісны крэдыт памерам $16,5 мільярда. Украіна атрымала з гэтых сродкаў тры траншы на агульную суму ў $10,6 мільярда. У канцы 2009 года фонд адмовіўся выдаваць чацвёрты, апошні транш крэдыту Украіне да правядзення прэзідэнцкіх выбараў.

### Кадафі ўвёў эмбарга супраць Швейцарыі

Лівія прыняла рашэнне ўвесці поўнае гандлёвае эмбарга супраць Швейцарыі. Краіна будзе шукаць альтэрнатыўных пастаўшчыкоў лекаў, а таксама медыцынскага і прамысловага абсталявання. Пасля забароны на будаўніцтва мінарэтаў, прынятай у Швейцарыі, лідэр Лівіі Муамар Кадафі ў канцы лютага абвесціў джыхад супраць цэнтральнаеўрапейскай краіны.

### Пуцін Януковічу: «Уступайце ў Мытны саюз»

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін адкрытым тэкстам прапанаваў Украіне стаць чацвёртым сябрам Мытнага саюза. Так ён адгукнуўся на прапанову прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча здзейсніць «круты паварот» у адносінах дзвюх краін.

**ЯМ**

# Памёр самы дасведчаны віляйчук

З сакавіка сышоў краязнаўца Анатоль Рогач.

Ён працаваў начальнікам раённых электрасетак. Неаднойчы выбіраўся ў раённы савет дэпутатаў. Дзяржслужбу сумяшчаў з беларускай культурніцкай дзейнасцю. Ён быў найлепшым знаўцам мінуўшчыны Вілейшчыны. Яго намаганнямі ў раёне паўсталі памятныя знакі вядомым землякам: Піліпу Орліку, Ігнату Ходзьку, Нікадзіму Сіліванавічу, Адаму Гурыновічу.

Пазалетась быў адкрыты помнік паўстанцам 1863 года каля вёскі Любкі. Планаваў краязнаўца паставіць яшчэ адзін, на месцы іншага боя каліноўцаў з царскімі войскамі. Ды не паспеў.

Анатоль Рогач нарадзіўся 1 чэрвеня 1947 года ў в. Каралеўцы на Вілейшчыне. Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1988 года ўзначальваў РЭС. У краязнаўстве Рогач не цураўся ніякіх тэм. Для яго не існавала ідэалагічных забаронаў. Ён напісаў сотні артыкулаў. Акрамя краязнаўства, у яго было яшчэ адно захапленне — шашкі. Анатоль Рогач з'яўляўся майстрам спорту па шашках па перапісцы.

**Кастусь Матушчыч**



## Пачалася рэгістрацыя абітурыентаў для прафесійна-псіхалагічнага сумоўя

Яно трэба для паступлення на асобныя прэстыжныя спецыяльнасці.

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства адукацыі ад 26 лютага 2008 года №17, прафесійна-псіхалагічнае сумоўе неабходна прайсці для паступлення на спецыяльнасці: «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і правы», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «правазнаўства», «эканамічнае права», «журналістыка», «міжнародная журналістыка», «мытная справа». Пры гэтым сумоўе неабходна прайсці ўсім абітурыентам незалежна ад таго, якую форму навучання яны выбіраюць.

Рэгістрацыя скончыцца 31 сакавіка.

**СГ**

## Баранавіцкай міліцыі здаўся «арганізатар» выбуху ў Мінску 2008 года

Мужчына, што патэлефанаваў 2 сакавіка ў Баранавіцкі ГАУС, паведаміў, што ён мае дачыненне да выбуху, што адбыўся ў 2008 годзе ў Мінску на Дзень незалежнасці. Больш за тое, цяпер ён рыхтуе новы выбух.

Суразмоўца паведаміў сваё прозвішча, імя, а таксама адрас, дзе ён знаходзіцца, пасля чаго паклаў трубку. Супрацоўнікі міліцыі, што выехалі на адзначаны адрас, сапраўды знайшлі там 31-гадовага мужчыну, які тэлефанаваў на спецлінію «102» са свайго мабільнага тэлефона.

Як высветлілася, да гэтага «арганізатар выбуху» некалькі разоў лячыўся ў Навінках у Мінску. З дыягназам «вострае псіхічнае расстройства» мужчына быў дастаўлены ў Баранавіцкі псіханеўралагічны дыспансер.

**Інтэкс-прэс**

## Самым смелым на з'ездзе фермераў быў... намеснік міністра сельскай гаспадаркі

Юбілейны з'езд фермераў Беларусі выдаўся надзвычай асцярожным.

З'езд, прысвечаны 20-годдзю фермерскага руху, прайшоў 3 сакавіка ў гатэлі «Беларусь» у сталіцы. Ён адбываўся ў атмасферы агульнай асцярожнасці і задаволенасці. Яна была парушана настойлівасцю аднаго з дэлегатаў, які літаральна ў апошнюю хвіліну запатрабаваў дадаць да рэзалюцыі сходу патрабаванне прыватнай уласнасці на зямлю.

Маторам кампаніі ўжо другое дзесяцігоддзе застаецца старшыня Беларускага грамадскага таварыства фермераў Канстанцін Ярмоленка. Ён з жалем канстатаваў, што за постсавецкі час было створана 6 тысяч фермерскіх гаспадарак. З іх засталося крыху больш за 2 тысячы. Умовы для фермерства не створаныя, мяркуе ён.

Самым смелым сярод астатніх удзельнікаў форуму выявіўся... намеснік міністра сельскай гаспадаркі Васіль Паўлоўскі. Ён расказваў прысутным пра тое, як днямі міністр даваў інтэрв'ю «Народнай волі», і адразу ж ухваліў ідэю выдзялення зямлі ў прыватную ўласнасць, параіўшы звяртацца ў найбліжэйшы час са сфармуляванай праграмай дзеянняў.

**Ягор Марціновіч**

## СЦІСЛА

### Стодаляравыя купюры абновяць

Улады ЗША пачнуць выпуск стодаляравых купюр новага ўзору. Прэзентацыя мае адбыцца 21 красавіка гэтага года. Змены выгляду купюр патрэбны дзеля змагання з фальшываманетчыкамі.

### Ісландыя: не аддаваць грошы замежнікам

93% жыхароў Ісландыі выказалася на рэфэрэндуме супраць выплат кампенсацый брытанскім і галандскім укладчыкам. У выніку краху ісландскіх банкаў тыя страцілі ад 3,8 да 5 мільярдаў еўра. Еўракамісія папярэдзіла, што адмова ад выплаты кампенсацый можа мець негатыўныя наступствы для сяброўства Ісландыі ў Еўрасаюзе.

**ЯМ**

## Гарэлі кнігі Чаргінца

У дзень мінскага канцэрта Rammstein скандальны блогер Ліпковіч зладзіў у Севастопальскім парку літаратурна-мастацкую акцыю «Аборонім маладую беларускую дзяржаўнасць ад экстрэмізму». Акцыя была сумнеўная з этычнага пункту гледжання. Яе ўдзельнікі спалілі кнігі Мікалая Чаргінца, які пратэставаў супраць прыезду нямецкіх музыкаў у Беларусь, называючы іх экстрэмістамі. «У гісторыі было шмат аматараў абараніць сваю дзяржаву ад экстрэмізму. Параноікаў заўсёды хапала», — каментаваў, распальваючы вогнішча, «кандыдат у кандыдаты» Яўген Ліпковіч.



GAZETABY.COM

## Піць нельга і ў лесе

і на аўтастаянках.

За распіванне спіртнога ў лясных масівах, на паплавах, на берагах вадаёмаў (пляжах) і ў іншых такіх месцах, што знаходзяцца па-за населенымі пунктамі, пагражае штраф. Ва УУС Мінаблвыканкама растлумачылі, што лясы і паплавы могуць лічыцца грамадскімі месцамі, калі група адпачывальнікаў ужывае спіртныя напіткі на вачах у іншых.

Піятыкі не дапускаюцца і на стаянках загарадных трас. Калі грамадзяне з'едуць на ўзбочыну і, згодна з народнай традыцыяй, арганізуюць застолле на капоце, міліцыя можа аштрафаваць іх. Узбочына — грамадскае месца, бо там бачна, што людзі п'юць.

«Рэформа прадыктаваная тым, што дэманстратыўнае піццё стала культываваца насельніцтвам», — падкрэслілі ў міліцыі.

Ад 23 лютага за распіванне ў грамадскіх месцах пагражае штраф да васьмі базавых велічынь (да 280 тыс. на сёння).

**Паводле БЕЛТА**

БЕЛАРУСЬ—ЕС

## Беларусь і Лісабонская дамова ў пытаннях і адказах

З першага снежня 2009 г. наш гіганцкі заходні сусед — Еўрасаюз — жыве па правілах Лісабонскай дамовы. Што яна сабой уяўляе і як паўплывае на стасункі Беларусі і Еўрасаюза, дапамог разабрацца Часовы паверани Прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Жан-Эрык Хольцапфель.

7 пытанняў пра Дамову аб рэформе

### 1. Што сабой уяўляе Лісабонская дамова?

Лісабонская дамова — гэта палегчаны варыянт Еўрапейскай канстытуцыі, прыняцце якой сарвалася ў 2005 годзе. Лісабонская дамова ўступіла ў дзеянне 1 снежня 2009 года, пасля ратыфікацыі ўсімі 27 краінамі Еўрасаюза.

Еўрасаюз набыў юрыдычнае аблічча і, як вынік, Прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі з 1 снежня 2009 г. стала называцца Прадстаўніцтвам Еўрасаюза.

### 2. У чым мэта падпісання і задачы Лісабонскай дамовы?

З 2004 па 2007 год колькасць краін Еўрасаюза рэзка павялічылася — з 15 да 27. Гэта выклікала неабходнасць рэфармаваць інстытуты ЕС.

Асноўныя задачы палітыкі ЕС, згодна з Лісабонскай дамовай, — гэта абарона грамадзян ЕС па ўсім свеце, захаванне эканамічнага, сацыяльнага і тэрытарыяльнага адзінства, культурнай разнастайнасці, шэраг сацыяльных мэтаў і некаторыя іншыя.

### 3. Якія галоўныя дасягненні Лісабонскай дамовы?

Паскорыліся працэсы прыняцця рашэнняў, па-другое, дзеянні ЕС у замежнай палітыцы сталі больш зладжанымі, па-трэцяе, узрасла дэмакратычнасць, дзякуючы большай ролі Еўрапарламента і нацыянальных парламентаў краін ЕС.

### 4. Як спрасцілася прыняцце рашэнняў ЕС?

Раней прыняцце заканадаўчых актаў у многіх сферах у Радзе ЕС магла заблакаваць усяго адна краіна, бо патрабавалася адзінагалосная згода міністраў ад усіх краін ЕС.

Цяпер для ўхвалення акта Еўрасаюза патрэбная згода мінімум 55% краін-чальцоў, у якіх пражывае не менш за 65% насельніцтва. Толькі па нешматлікіх пытаннях, такіх, як бюджэт ЕС, замежная палітыка і падаткі, рашэнні будуць і надалей прымацца адзінагалосна.

### 5. Якім чынам прыняцце рашэнняў у ЕС стала дэмакратычным?

Цяпер практычна па ўсіх пытаннях патрабуецца згода еўрадэпутатаў. Падтрымка Еўрапарламентам зніжэння кошту мабільнага роўмінгу ў краінах ЕС паказала, што ўдзел Еўрапарламента можа прывесці да смелых рашэнняў у інтарэсах грамадзян ЕС.

### 6. Чым займаецца Вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежнай палітыцы?

Вярхоўны прадстаўнік ЕС па пытаннях замежнай палітыкі і палітыкі бяспекі — фактычна міністр замежных справаў Еўрасаюза. З увядзеннем гэтай пасады Еўрасаюз будзе развіваць стасункі з іншымі краінамі як адзіная структура і стане глабальнай сілай. У падпарадкаванні Вярхоўнага прадстаўніка будзе знаходзіцца новы орган — Еўрапейская служба замежнага дзеяння.

Новая пасада не замяшчае незалежную замежную палітыку краін ЕС, але дзейнічае на падставе рашэнняў, якія адзінагалосна прымаюцца ўсімі 27 краінамі ЕС.

На гэтую пасаду была абраная брытанка Кэтрын Эштан. 25 лютага 2010 г. яна сустракалася з міністрам замежных справаў Беларусі Сяргеем Мартынавым у Кіеве, у дзень інаўгурацыі ўкраінскага прэзідэнта Віктара Януковіча.

### 7. Навошта стваралася пасада Прэзідэнта Еўрапейскай Рады?

Увядзенне гэтай пасады мусіць забяспечыць зладжанасць працы Еўрапейскай Рады і паспрыяць кансэнсусу паміж еўрапейскімі лідэрамі. Да прыняцця Лісабонскай дамовы дзейнічала сістэма змены старшыняў ЕС раз на 6 месяцаў. З увядзеннем Лісабонскай дамовы Прэзідэнт ЕС (ім быў абраны бельгіец Герман ван Ромпей) стаў абірацца раз на 2,5 года з магчымасцю пераабрання.

Еўрапейская Рада вызначае прыярытэты і галоўныя напрамкі палітыкі Еўрасаюза. У яго ўваходзяць прэзідэнты і прэм'ер-міністры краін ЕС, якія праводзяць чатыры рэгулярныя сустрэчы на год, так званыя Саміты ЕС.

# Бег са сцягам дае свабоду

**Андрэй Караленка з Жодзіна за год прабег з бел-чырвона-белым сцягам у 23 марафонах.**








Спадар Андрэй пачаў сур'ёзна займацца бегам толькі ў 64 гады. Нечакана для сваякоў у 70 гадоў ён адолеў дыстанцыю ў 31 кіламетр. Пры гэтым на ўсе афіцыйна арганізаваныя марафоны жодзінскі пенсіянер выходзіць выключна ў форме з бел-чырвона-белым сцягам.

Андрэй Караленка больш за 30 гадоў адпрацаваў на БелАЗе інжынерам-канструктарам. Быў дэпутатам Жодзінскага гарсавета, памочнікам дэпутата Вярхоўнага Савета. Падчас пераходу Беларусі да незалежнасці пачаў размаўляць па-беларуску, уступіў у БНФ, хадзіў на мітынгі.

Зімою 2000 года на лецішчы Караленка нечакана знайшоў шчанюкоў. Аднаго пакінуў сабе і вясной пачаў яго выгульваць. Маленькі сабачка бегаў шпарка, і Андрэю Паўлавічу мімаволі прыходзілася даганяць яго. 64-гадовы пенсіянер змяніў боты на кеды і стаў рабіць прабежкі на 3 км. Уцягнуўся. І дабегаўся да таго, што аднойчы яго запрасілі ў клуб аматараў бегу на БелАЗе.

На «Мінскай восені — 2001» Андрэй Паўлавіч упершыню адолеў дыстанцыю ў 10 км. Яшчэ праз некалькі гадоў, калі яму было ўжо 70, пенсіянер здзівіў блізкіх — на Маладзечанскім марафоне ён прабег 31 кіламетр!

— Найбольш складана мне бегчы дыстанцыю ў 5 км. Бягуць даволі хутка. А мне, старому, не хочацца ад цётак адставаць, хоць яны і маладзейшыя за мяне, — расказвае Андрэй Караленка. — А вось на «дзясятцы» можна павольна ўваходзіць у бег: прабег чатыры кіламетры — і пасля бяжы яшчэ хоць чатырнаццаць.

Андрэй Паўлавіч інвалід па зроку. Але займацца спортам яму гэта не перашкаджае. Наадварот: спорт дапамагае лекаваць хваробу.

— Як я пачаў бегаць, у мяне спыніліся адмоўныя працэсы ў вачах! — адзначае пенсіянер. — Можа быць, бег паспрыяў таму, што я ўвогуле яшчэ бачу...

Андрэй Паўлавіч на дыстанцыі вылучаецца заўсёды. Караленка бегае ў форме з бел-чырвона-белым сцягам.

— Спачатку здзіўляліся, але на трасе ўсе роўныя. Я беларус, гэта мой дом, мая зямля. Апазіцыя — гэта тыя, хто чырвона-зялёныя, — лічыць Андрэй Пятровіч. Але затым дадае: да бегуноў у чырвона-зялёнай форме ён ставіцца з разуменнем.

А вось з ім аднойчы здарыўся прыкры выпадак. 3 ліпеня мінулага года пенсіянера схапілі перад стартам на «Мінскім марафоне». У суправаджэнні аўтаматчыка даставілі ў ГАУС, пратрымалі некалькі гадзін...

За мінулы год пенсіянер з Жодзіна прабег дыстанцыі ад 10 да 21 км на 23 марафонах. Апошні старт быў у Мінску пры канцы снежня пры 15-градусным марозе. Цяпер, калі няма маразоў і снегу, Андрэй Паўлавіч бегае тры разы на тыдзень: у аўторак — 7—10 км, у чацвер — 7—10 км, у нядзелю — 15 км. Калі гэта яму ўдаецца, ён адчувае сябе свабодным.

Да рэкордаў Караленка не імкнецца. Хоча толькі праз год, калі яму будзе 75, прабегчы паўмарафонскую дыстанцыю, 32 кіламетры.

**Руслан Гарбачоў, gazetaby.com**

## «Містэрам свету — 2010» стане беларус?

**На міжнародным конкурсе харства «Містэр свету — 2010» Беларусь мае ўсе шанцы перамагчы. Ад нашай краіны едзе моцны кандыдат. Моцны ва ўсіх сэнсах.**



21-гадовы студэнт Універсітэта фізкультуры Міхаіл Баранаў — майстар спорту ў дзюдо. Да таго ж, ён прафесіянал подыума. І рыхтуецца да паездкі ў Сеул (Паўднёвая Карэя) ён на поўным сур'ёзе, як да самага важнага чэмпіянату.

Гэтымі днямі ён прымярае адзенне, распрацаванае самым папулярным з айчынных мадэльераў Іванам Айплатавым. Айплатаў ужо добра знаёмы з Баранавым. Упершыню тандэм мадэльера і мадэлі працаваў на Тыдні моды ў Маскве ў 2009 годзе.

За тытул «Містэр свету» з 27 сакавіка будуць змагацца ўдзельнікі з 80 краін. Конкурс будзе доўжыцца аж 17 дзён! Прыйдзецца спаборнічаць не толькі ў харастве, а і ў фізічнай сіле, стойкасці і кемлівасці. Лепшыя з лепшых возьмуць удзел у фінале, дзе будзе ацэньвацца іх стыль, выступленне і асабістыя якасці. Падрыхтоўкай удзельніка да спаборніцтва займаецца цэлая каманда Нацыянальнай школы харства.

**СГ; БелаПАН**

КРЫМІНАЛ

## Палкоўнік, што кіраваў бандытамі

**20 гадоў дзейнічала банда. Існавала б і далей, калі б у жыцці палкоўніка не з'явілася 20-гадовая Наташа.**

У Бабруйску судзілі банду, якую ўзначальваў адстаўны палкоўнік. У 1990-я ён працаваў дырэктарам завода, кіраваў будпадраздзяленнем Мінабароны. У яго былі сувязі, але не было магчымасці зарабляць вялікія грошы, таму ён і вырашыў пазнаёміцца з крымінальнікамі.

Банда абклала данінай усіх, хто займаўся незаконнымі аперацыямі з каляровымі металамі. Палкоўнік «зліваў» інфу пра каналы збыту, а бандыты карысталіся. Яго бандыты клікалі «Генералам» і «Бацем», «на справу» ён не хадзіў.

У 2000 годзе палкоўнік выходзіць на пенсію. Ён зарабіў капітал, частку грошай уклаў у бабруйскі рынак «Паўночны», пасля з'ехаў у Маскву, арганізаваў будаўнічую кампанію «Рос». У Маскве ён сустракаўся са злодзеем у законе Біруковым, больш вядомым як Біра. Палкоўнік даваў крымінальнікам грошы на іх патрэбы — то дзве тысячы даляраў, то тры.

Магчыма, банда існавала б і далей, калі б у жыцці палкоўніка не з'явілася 20-гадовая Наташа. Палкоўнік падарыў ёй кватэру ў Бабруйску, крамку ў гандлёвым цэнтры. Але Наташа закруціла раман з крымінальнікам з канкурэнтнай групоўкі. Летам 2007 г. таго расстралялі ў Наташыным пад'ездзе.

Адпрацоўваючы версію забойства з рэўнасці, следчыя сталі вывучаць асобу палкоўніка. І зразумелі, што гэта за камерсант.

Па справе праходзяць 20 чалавек. Вайсковы суд асудзіў палкоўніка на 20 гадоў турмы. Былі даказаны 15 злачынстваў, здзейсненых бандай.

**Паводле kp.by**

## У Швейцарыі выпусцяць прэзерватывы для «самых маленькіх»

Неўзабаве ў продаж у Швейцарыі паступяць спецыяльныя прэзерватывы. Кантрацэптывы Hotshot будуць мець пазнаку «extra small» і прызначацца пераважна для карыстальнікаў ад 12 да 14 гадоў. Дыяметр новых прэзерватываў — усяго 45 мм, тады як стандартны мае 52 мм.

Чакаецца, што іх з'яўленне ў продажы выкліча ажыятажны попыт. Кампанія Lamprecht AG плануе пашырыць продажы за кошт іншых краін Еўропы. У прыватнасці — Брытаніі, дзе праблема цяжарнасці сярод непаўналетніх стаіць востра. Вытворцы падаюць дадзеныя апытання сярод рэспандэнтаў 13—20 гадоў, паводле якога 25% заявілі аб тым, што стандартныя прэзерватывы для іх завялікія.

У той жа час выпуск новай прадукцыі выклікаў крытыку вернікаў. Яны кажуць: найлепш засцерагаць ад распусты, а не засцерагаць распуснікаў.

**ЯМ**

СЦІСЛА

### ІП «нагрэў» на 300 тысяч даляраў

АБЭЗ затрымаў сталічнага індывідуальнага прадпрымальніка, раней судзімага за махлярства. Падазраваны падбухторваў грамадзянаў даваць хабар нібыта службовым асобам сельсаветаў Мінскага раёна за пастаноўку ў чаргу на кватэру, пазачарговае выдзяленне зямельных участкаў. З 30 выяўленых пацярпелых ён выцягнуў больш за 300 тысяч даляраў.

### Фізрука злавілі на хабары

56-гадовы фізрук з Ліды падазраецца ў атрыманні хабару ад студэнтаў за выстаўленне завышаных адзнак, вывядзенне сярэдняга бала, неабходнага для атрымання стыпендыі, за спісанне адпрацовак. Выкладчыка злавілі ў лютым, калі ён атрымліваў хабар у 140 тысяч рублёў. Яму інкрымінуецца яшчэ некалькі злачынных эпізодаў. У якасці хабару былі і 50 даляраў, і паўтоны брыкету.

### Забіла немаўля

Мінскі абласны суд даў 10 гадоў турмы 43-гадовай жыхарцы Узды, абвінавачанай у наўмысным забойстве свайго немаўляці. Маці пецярых дзяцей абвінавачваецца ў тым, што ў канцы лістапада 2009 года забіла шостае дзіця. Немаўля яна паклала ў поліэтыленавы пакет і кінула ў туалет. Абвінавачваная раней ужо была асуджаная за замах на забойства чацвёртага дзіцяці ў сям'і.

**СМ; БелаПАН**

# Святкуюць усё

У чым сакрэт папулярнасці савецкіх святаў? Проста беларусы любяць весяліцца. Піша **Сямён Печанко**.

Набліжэнне кожнага свята, што засталіся нам у спадчыну ад саветаў, выклікае жарсці ў беларускай благасферы. І прорва між працаўнікамі таталітарнай культурнай спадчыны і яе прыхільнікамі ўсё шырыцца.

Кожнае 9 Мая суправаджаецца ўзаемнымі выпадамі з выкладаннем у сеціва выяваў георгіеўскіх стужак на антэне любімага аўто з аднаго боку і фотаздымкаў нецвярозых удзельнікаў святкавання з другога. 23 лютага дзеліць беларускіх мужчынаў на тых, хто «служыў у армейцы», і тых, хто адзначае ў гэты дзень угодкі стварэння Беларускай краёвай абароны. Спрэчкі наконт 8 Сакавіка ўсё часцей набываюць гендэрны характар, усё далей выцясняючы ідэалагічны складнік з гэтага свята...

А што ж сярэднестатыстычны беларус, які пра інтэрнэт ведае ад дзяцей-школьнікаў? Людзі купляюць сабе кветкі букетамі ды торты на 8 Сакавіка, шкарпэткі і адэкалоны на 23 лютага, ды, знай сабе, святкуюць, як апошні дзень жывуць. І ім усё адно, што там сабе думалі Клара Цэткін і Роза Люксембург сто гадоў таму, чые страты ў чалавечых жыццях у 1918 годзе пад Псковам былі большыя. Галоўнае — нагода.

За гады незалежнасці грамадства не дайшло да згоды наконт уласных сапраўды агульнанародных святаў, што ядналі б усіх.




А весяліцца наш чалавек любіць. Таму і адзначаюцца ў нас мала не з аднолькавым імпэтам і аднолькавым спосабам святы рэлігійныя, свецкія і савецкія.

# Допыт Усхопчыка прынёс Лукашэнку запрашальнік у Вільню

Цяпер і генерал трапіў у палітычныя закладнікі. Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Літоўскія крыніцы паведамляюць, што Грыбаўскайтэ запрасіла Лукашэнку на святкаванне 20-годдзя аднаўлення незалежнасці сваёй краіны. Няма сумневу, што гэта рэакцыя на допыт генерала Усхопчыка.

Днямі яго дапыталі ў беларускай Генпракуратуры і накіравалі пратакол у Вільню. Як там і хацелі.

Мінск доўга ўпарціўся, калі літоўцы бамбардавалі запытамі па «справе Усхопчыка». Нагадаю: яго, колішняга камандзіра віленскага гарнізона, у суседняй краіне вінавацяць за крывавыя падзеі студзеня 1991 года.

Пытанне Усхопчыка стала сімвалічным для абодвух бакоў. Вільня прагне суда над тым, хто, як мяркуецца, датычны да гібелі змагароў за незалежнасць. Мінск жа яўна не хоча здаваць былога савецкага генерала, каторы, мяркую, быў абавязаны выконваць загады Масквы.

Урэшце Грыбаўскайтэ, якую крытыкавалі яшчэ за леташні візіт аўтарытарнага суседа, мусіла наўпрост выставіць умову, звязаўшы запрашэнне на ўрачыстасці 11 сакавіка з «пераломам» у пытанні пра Усхопчыка.

Натуральна, ягоны допыт — не самадзейнасць айчынных пракурораў. Яны б і пальцам не варухнулі без адмашкі. Гэта азначае, што Лукашэнку, пры ўсёй ягонай бравадзе (нам Еўропа не ўказ!), усё ж карцела атрымаць запрашэнне ад калегі з Еўрасаюза.

І ўвогуле, у дачыненнях з Еўропай пайшла адкрутка назад. Зроблены рэверанс перад Варшавай: 9 сакавіка адмысловая камісія, якую Лукашэнка паабяцаў стварыць, калі гутарыў у Кіеве з польскім міністрам Сікорскім, пачне разбірацца з праблемамі Саюза палякаў. І Варшава апрыёры сціпшыла тон. Літоўцы, як бачым, таксама задавальняюцца сімвалічным жэстам, бо, як зазначае палітолаг Валер Карбалевіч, ніхто Усхопчыка выдаваць не збіраецца.

Беларускае кіраўніцтва выдатна асвоіла метады маніпулявання палітычнымі закладнікамі. Цяпер вось у іх лік нечакана трапіў і адстаўны генерал.

Такім чынам, допыт Усхопчыка даў плён. Запрашальнік з Вільні атрыманы, амбіцыі задаволеныя. А ехаць ці не ехаць на ўрачыстасці, вырашаў ужо Лукашэнка.

Тут былі далікатныя моманты. Так, існуе версія, што беларускі кіраўнік невыпадкова спазніўся на інаўгурацыю Януковіча: маўляў, не ўсе высокія госці праглі такога суседства.

І яшчэ пікантны момант: Мядзведзеў ад запрашэння Грыбаўскайтэ адмовіўся. Калі Лукашэнка паедзе, то гэта будзе і выклік Маскве. Асабліва калі на выездзе прагучаць нейкія красамоўныя публічныя заявы.

Так ці інакш, Лукашэнка даў задні ход у дачыненнях з Еўропай. Спальваць масты надта ж недарэчы.

# Казакі і «Русская культура в Белоруссии»

З пагаршэннем беларуска–расійскіх адносін пачалі пладзіцца сайты, са старонак якіх ліецца крытыка на адрас афіцыйнага Мінска. Піша **Сямён Печанко**.

«Мужественные, смелые, беззаветно преданные своей Родине казаки были социальным слоем белорусского народа, верно служили ему, защищая нашу русскую сущность и православную культуру от католического влияния». Гэта радкі з артыкула «О белорусском казачестве» на сайце Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белорусское казачество». Такія перлы можна пачуць не толькі ад гэтак званых беларускіх казакоў. У сеціве пачалі пладзіцца сайты, з чыіх артыкулаў можна даведацца «ўсю праўду» пра мінулае і сённяшняе Беларусі. Некаторыя з іх, напрыклад, вышэйпамянёны «Белорусский казак», выказваюць поўную лаяльнасць да ўлады і асабіста кіраўніка краіны. Але большасць гэтых рэсурсаў яднае рэзка крытычнае стаўленне да афіцыйнага Мінска.

Інфармацыйна-аналітычны партал «Империя», нядаўна створанае інфармацыйнае агенцтва Regnum-Беларусь (адгалінаванне расійскага федэральнага інфармацыйнага агенцтва Regnum) у артыкулах, прысвечаных адносінам паміж Беларуссю і Расіяй, не саромеюцца ў выразах. Лукашэнку на іх малююць хітрым прыстасаванцам, што не супраць і далей смактаць расійскую нафтагазавую цыцку, але пры гэтым і з Еўропай пачынае пераміргвацца.

«З аднаго боку, у кіраўніцтва РБ ёсць вялізнае жаданне атрымліваць ад Расіі прэферэнцыі ў ранейшым аб'ёме, выкарыстоўваючы статус найбліжэйшага стратэгічнага саюзніка. І расійскія мыты на нафту і нафтапрадукты — толькі асобнае пытанне ў дадзеным выпадку. (...) З іншага боку, мы бачым наколькі, мякка кажучы, няспешна адбываецца выкананне Беларуссю свайго саюзніцкага абавязку ў прызнанні суверэнітэту і дапамозе Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, колькі часу і сілаў аддадзена афіцыйным Мінскам «Усходняму партнёрству», як складаецца супрацоўніцтва з расійскімі інвестарамі, навуковая кааперацыя і г.д.», — піша Regnum-Беларусь.

Далучэнне Беларусі да «Усходняга партнёрства» відавочна з'яўляецца адной з самых балючых тэмаў для расійскіх аналітыкаў з «Империй» ды «Регнумов».

Тут ужо і да непрыхаваных пагроз даходзіць: «Калі так будзе працягвацца і далей, то хутка Расія прыйдзе да таго, што яе перастане хваляваць, хто менавіта ў дадзены момант сядзіць на беларускім пасадзе. (...) Масква не будзе падтрымліваць у Беларусі ніякія альтэрнатыўныя Лукашэнку сілы. Аднак, калі галоўным фактарам робіцца своечасовасць выплат, дык ці не ўсё адно, хто іх ажыццяўляе?»

Адначасова з крытыкай афіцыйнага Мінска са старонак гэтых рэсурсаў даводзяцца тэзы пра несамастойнасць Беларусі як краіны, адсталасць культуры. Усё часцей чуюцца абураныя галасы пра «гаротны стан» усяго расійскага ў Беларусі.

«Расійская культура ў Беларусі знаходзіцца ў... абсалютна ненатуральным становішчы. З аднаго боку, у Беларусі дэ-факта склалася расійская дзяржава — у асноўным расійскамоўнае насельніцтва, трывалыя пазіцыі расійскіх і мясцовых расійскіх СМІ, папулярнасць расійскага кінематографа, літаратуры, музыкі. З іншага боку, складаецца такое ўражанне, быццам слова «расіец» у Беларусі знаходзіцца пад забаронай», — піша Аляксандр Залатніцкі.

Паказальны выпадак — скандал вакол віцебскага чыноўніка Андрэя Герашчанкі, старшыні грамадскага аб'яднання «Русский дом». Публікацыі ў беларускай прэсе і наступная прапанова чыноўніку звольніцца выклікалі сапраўдны гармідар на расійскіх сайтах. Герашчанку абвясцілі ахвярай палітычных рэпрэсій, а сам скандал, не больш і не менш, спробай разбурыць так званую саюзную дзяржаву. І як выснова — Расіі трэба паболей надаваць увагі «сопредельным территориям».

Характэрна, што антылукашэнкаўская рыторыка ў спалучэнні з замшэлымі тэорыямі «паходжання» Беларусі ўзмацнілася адносна нядаўна. Відавочна, што каталізатарам стаў канчатковы пераход да прагматычных адносін. Магчыма, праз свае інтэрнэт-рупары Масква дае зразумець, што не лічыць больш бязменнага беларускага лідэра такім ужо незаменным, але і «нацыяналіста» на ягоным месцы не пацерпіць.

БЕЗ КАМЕНТАРОЎ

## Пяткевіч пра нашы патрэбы

«Прыемна адзначыць, што на прыватных прадпрыемствах ажыццяўляецца ідэалагічная праца, і гэта не ціск зверху, а сапраўды патрэба».

**З выступу Наталлі Пяткевіч у Кобрыне (Брэсцкая вобласць)**

З КАМЕНТАРОЎ НА NN.BY

## Ганьба куратніку

Байка.

Ліса заведвала курамі.
І каб прыстойнасць захаваць,
яна душыла іх начамі,
а днём лягала спачываць.

А куры дралі пёры з крыл
і дасылалі скаргаў стосы —
Ліса тапіла імі грыль
і з іх круціла папяросы.

Ніяк не зразумеюць куры:
пры такім кіраўніку
скаргі — тып макулатуры
і ганьба куратніку.

**Кнехт**



Антон Матолька

# Rammstein гуляў з агнём

і паліваў публіку пенай з бетонамяшалкі.

Такога канцэртнага шоу па маштабах і па якасці ў Беларусі яшчэ не было. Нямецкі гурт «Рамштайн» прыцягнуў за сабой кіламетровы ланцуг фураў з абсталяваннем і дэкарацыямі. Паслухаць сусветна папулярных музыкаў у новазбудаванай «Мінск-Арэне» сабралася 11 000 гледачоў. Мінск прайшоў выпрабаванне: пасля поспеху «Рамштайна» Беларусь перастане быць закрытай тэрыторыяй для еўрапейскіх тураў іншых сусветных зорак.

Яшчэ «Рамштайн» паказаў, на якім узроўні сёння ў Еўропе шоу-бізнэс. Відовішча было захапляльным, тэхнагенна складаным, эмацыйна напаленым і паліткарэктным адначасова. Чаргінец дарэмна баяўся.

Чорна-чырвона-жоўтыя шлейкі і папругі, такія самыя сцягі (з федэральным арлом або з гэдээраўскім цыркулем), белыя спартовыя касцюмы з надпісам Germany — мінская публіка зрабіла ўсё, каб рок-гурт «Рамштайн» не сumаваў па радзіме на гастролях.

Калі ты на шоу, то факт, што «Рамштайн» неарыгінальны ў музыцы, не мае значэння. Бо ўвесь досвед, назапашаны чалавецтвам у майстэрстве ладжання рок-шоу, быў выкарыстаны тут. Талкова падабраны «разагрэў», агрэсіўны грым, сцэнічныя касцюмы са скуры, узлёты, падпалы нібы выпадкоўца з натоўпу, выбухі і фаер-шоу з лёзамі полымя, жар якога сягаў нават у самыя зацішныя куткі залы...

А індустрыйны інтэр’ер агромністай, навюткай і страшэнна бюджэтнай «Мінск-Арэны» як найлепей адцяняў дэманічны біт бубнаў і пякельны грукат гітар.

## Непрыхаваная прапаганда канфеці

Напярэдадні канцэрта грамадская рада па маральнасці на чале са старшынёй лукашэнкаўскага Саюза пісьменнікаў Мікалаем Чаргінцом пратэставала супраць выступу нямецкіх музыкаў у Мінску. Бо яны, сцвярджала рада, «уяўляюць сабою непрыхаваную прапаганду гомасэксуалізму, мазахізму ды іншых вычварэнняў, лютасці, гвалту і непрыстойнай лаянкі».

Прапагандай гомасэксуалізму падчас шоу можна было лічыць хіба каляровыя, колеру вясёлкі і сэксменшыняў, канфеці, што сыпалася згары.

Мазахізму? А як жа: удзельнікі гурта былі зацягнутыя ў скуру і заклёпкі, і час ад часу гэтыя здаровыя дзядзькі брутальна скакалі адзін на аднаго. Пры жаданні можна было жыва ўявіць якую-небудзь садамаза-сцэну.

Іншых вычварэнняў? Без іх нікуды: саліст з бетонамяшалкі паліваў публіку вялікімі камякамі пены.

Сцэны лютасці і гвалту? Як жа, было: «канфлікт» фронтмена з клавішнікам Крысціянам Лорэнцам. Ліндэман схапіў Лорэнца і шпурнуў у невядома адкуль матэрыялізаваную пасярод сцэны ванну. Потым узняўся на пяціметровую вышыню над сцэнай і адтуль абсыпаў клавішніка жарынкамі. Той ператварыўся ў робата ў вопратцы з бліскаўкамі і пачаў як бы механічна граць на сваіх сінтэзатарах. Пры гэтым да канца шоу ён бег па рухомай дарожцы, што з’явілася ў яго пад нагамі.

## Еўрастандарт

«Рамштайн» заўсёды працаваў на сутыку жанраў: націск металу, загадкавасць індастрыялу, выйгрышныя тэмы гатычных і танцавальных рытмаў — усё ўключана. І дадамо добра прадбачаны катарсіс з фаерверкам пры канцы шоу — еўрастандарты нават у мастацтве. А яшчэ заўсёдны, безупынны эпатаж, ігра на стэрэатыпах аб немцах, выпрабоўванне межаў трываласці публікі.

Насуперак старэйшым братам па металу і землякам, Scorpions і Accept, якія аддалі перавагу экспартнай, англійскай мове, рамштайнаўцы не ўзбаяліся зрабіць стаўку на нізкі рэгістр роднай нямецкай. Дарэчы, мінская публіка проста здзівіла, калі на поўныя грудзі зацягнула па-нямецку ўслед за Ліндэманам гіт Du hast.

Канцэрт «Рамштайна» — усё роўна як фільмы Ціма Бёртана, дзе вытанчаны антураж і дзівосныя персанажы , якія спляліся ў трохі пачварнае відовішча, ад якога не страшна, ад якога хочацца жыць.

**Павал Касцюкевіч**

### Гурт Rammstein

існуе з 1994. Назва перакладаецца як «Таранны камень». Усе артысты гурта — з былой ГДР. Rammstein выступіў у Мінску ў рамках сусветнага тура гурта, прысвечанага выхаду новага альбома Liebe ist für alle da («Каханне існуе для ўсіх») пасля чатырохгадовага перапынку. Гурт выканаў на канцэрце як кампазіцыі з новага альбома, так і вядомыя хіты.

### Каманда «Рамштайна»

Гурт гастралюе з 20 грузавікамі абсталявання і шасцю аўтобусамі для персаналу. У Мінск прыбылі 140 чалавек — музыкі, менеджэры, тэхнічны персанал і абслуга. Яшчэ 200 чалавек для падрыхтоўкі канцэрта былі нанятыя ў Мінску.

### «Рамштайн» сам сабе гатуе

Побытавы райдэр гурта, паводле слоў арганізатараў, мае адну асаблівасць — музыкі самі арганізоўваюць харчаванне. Абслуга закупляе прадукты і гатуе ежу. Для гэтых мэтаў у «Мінск–Арэне» быў арандаваны рэстаран. Для пражывання музыкі самі выбралі сталічны гатэль. Які менавіта — не раскрываецца ў мэтах бяспекі.

### Ліндэман падпаліў чалавека

Агнявое шоу, якім славутыя канцэрты Rammstein, пачалося на трэцяй песні, Keine Lust.

Агню было шмат — агнявыя «гарэлкі» ў руках у музыкантаў, феерверкі, крылы, якія гарэлі проста на вакалісту Тылю Ліндэману. Падчас песні Benzin Ліндэман выкаціў на сцэну бензакалонку і падпаліў яе. У гэты момант на сцэну з залы нечакана выбег чалавек, якога вакаліст абдаў струменем агню. Ахопленая полымем фігура замітусілася па сцэне, і тэхнічная служба загасіла агонь.

Толькі калі Ліндэман падышоў да чалавека, які ляжаў на падлозе, і піхнуў яго нагой, стала зразумела, што гэта была не выпадковая ахвяра, а ўдзельнік шоу.

### На хвалях залы

У канцы выступлення ў залу традыцыйна запусцілі гумовую лодку з адным з музыкантаў. Фанаты на руках пранеслі лодку, а затым вярнулі назад на сцэну, дзе ўдзельнікі гурта разгарнулі дзяржаўны чырвона–зялёны сцяг Беларусі. Музыканты двойчы выходзілі на біс, а Ліндэман падзякаваў публіцы за бурны прыём, сказаўшы: «Дзякуй! Вялікі дзякуй! Мы рады вас тут бачыць! Ram любіць вас!»

### Чаргінец — супраць, Латушка — не

Прыезд Rammstein у Беларусь стаў прычынай дыскусій. Грамадская рада па маральнасці на чале з пісьменнікам Мікалаем Чаргінцом настойвала на папярэднім праглядзе канцэртнай праграмы, абвінавачваючы калектыў у прапагандзе гвалту, парнаграфіі, жорсткасці і нацызму. Міністэрства культуры запытала ў арганізатараў матэрыялы канцэртнай праграмы. Арганізатары запэўнілі чыноўнікаў, што канцэрт адбудзецца «ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі». Што і рэтрансляваў міністр Латушка, супраць якога былі скіраваныя стрэлы Чаргінца.

КАМЕНТАР

# Мода і яе цана

Піша **Сяргей Мікулевіч**.

Мы робімся рабамі рэчаў, пісаў Чак Паланік. Робімся нявольнікамі моды, уяўленняў пра прэстыж і стыль.

Калі чалавек пагаджаецца з правіламі масавай культуры, яму прасцей жыць, бо ён далучаецца да большасці аднагодкаў. Але плаціць за гэта свабодай, дазваляе сабой маніпуляваць.

Хоць тыя маніпуляцыі ўспрымае як уласны асэнсаваны выбар. Усе ідуць на «Рамштайн»! «Рамштайн» — гэта крута! І людзі без шкадавання аддаюць па сто даляраў за білет.

За мільён даляраў, што вылецеў з людскіх кішэняў у агністыя феерверкі «Мінск-Арэны», можна было прааперaваць і ўратаваць сорак хворых дзяцей. Або збудаваць дваццаць дамоў для незаможных. Або ўкласці і выдаць усе слоўнікі беларускай мовы, так патрэбныя для яе развіцця і ўзбагачэння, на складанне якіх незалежнаму грамадству проста бракуе грошай.

У красавіку гіганцкую «Мінск-Арэну» запоўняць прыхільнікі «Скорпіонз». Хто наступны? Часы Вудстока і падзення Берлінскай сцяны ззаду. На Захадзе такая музыка стала проста спосабам зарабляць вялікія грошы.

Так, «Рамштайн» — не «фанера», немцы прывезлі якаснае эстраднае шоу. Але не больш. Шоу, якое ўражвае тэхналогіямі, вызваляе ад эмоцый. Але нічога не дае для развіцця асобы. І што каштавала такіх вялікіх грошай? Агонь? Гучная музыка? Рухі па сцэне пяці чалавек? Гэта штосьці накшталт высокабюджэтнага цырку. Хто пойдзе ў цырк за сто даляраў? Няма дурных.



## Прынц Чарльз з жонкай наведаюць Белавежскую пушчу

Яны пабачаць зуброў і Крушыняны.

Яго каралеўская высокасць Чарльз, прынц Уэльскі, разам з жонкай Камілай, герцагіняй Карнуольскай, маюць намер на наступным тыдні наведаць Белавежскую пушчу. Наведаюць яны Пушчу па польскі бок мяжы.

Прынц Чарльз і яго жонка выказалі жаданне ўбачыць «белавежскіх зуброў у іх унікальным прыродным асяроддзі». Яны даўно чулі пра гэты ўнікальны першабытны лес, які ў дагістарычныя часы распасціраўся на ўсю Еўропу, а цяпер захаваўся толькі на беларуска-польскай мяжы.

Прадстаўнікі каралеўскай дынастыі таксама маюць наведаць і невялікую вёску на польска-беларускай мяжы — Крушыняны, з яе старадаўняй драўлянай мячэцю . Тут жывуць нашчадкі татараў, якія апынуліся ў гэтых мясцінах пры канцы XVII ст. Прынца і яго жонку цікавіць, як адчувае сябе татарская меншасць, карэннае мусульманскае насельніцтва ў краіне, дзе пераважаюць рымска-каталіцкія традыцыі.

Апошні раз кароль Англіі наведваўся ў нашы мясціны, бадай, разам з крыжакамі.

**Сяргей Мікулевіч**

## Пасольства Літвы выдала чвэрць шэнгенскіх віз бясплатна

Бясплатна выдаюцца візы студэнтам, артыстам, навукоўцам, спартоўцам.

Пра гэта паведаміў пасол Эдмінас Багдонас 9 сакавіка на прэс-канферэнцыі.

У цэлым штодзень консульская служба літоўскага пасольства выдае каля 400 віз. «Разумеючы ўсю складанасць атрымання шэнгенскай візы, мы імкнёмся зрабіць так, каб чалавек мог атрымаць шматразовую візу. 45% усіх выдадзеных летась віз былі шматразовыя на год», — сказаў ён.

Дыпламат адзначыў, што працэс атрымання візы ў пасольстве «зрабілі як мага больш лёгкім». Паводле яго слоў, на сайце ў інтэрнэце цяпер можна запоўніць анкету на атрыманне візы і запісацца ў чаргу на падачу дакументаў.

«Мы зрабілі ўсё магчымае, каб беларускія грамадзяне, якія атрымліваюць у нас візы, адчувалі сябе камфортна», — падкрэсліў Багдонас.

**БелаПАН**

## Дзеля джынсаў ковенцы раздзеліся да трусоў

У аўторак раніцай у гіпермаркеце «Акропаліс» у Каўнасе (Літва) прайшла акцыя — адкрыццё новай крамы. Першыя 20 наведнікаў, якія прыйшлі ў краму ў споднім, бясплатна атрымалі джынсы.

Большая частка ўдзельнікаў акцыі — хлопцы, аднак расспрануцца не пабаяліся і некалькі дзяўчат. Першыя пакупнікі сталі збірацца ля крамы ад самага рання. Першыя 20 голых пакупнікоў атрымалі падарункі, а астатнія — чэкі на суму 50 літаў (55 000 рублёў).

**delfi.lt**



## У Бельгіі выйшла 3D-газета

Кожнаму пакупніку штотыднёвай спартыўнай газеты La Derniere Heure прапануюцца спецыяльныя бясплатныя акуляры, якія дадуць магчымасць глядзець усе фатаграфіі на старонках выдання ў трохмерным адлюстраванні. «Гэта прэм'ера для Бельгіі і, магчыма, для Еўропы», — заявіў галоўны рэдактар Убер Леклерк. Паводле яго слоў, газета надрукавана на «паперы больш высокай якасці, бялейшай, якая забяспечвае лепшы эфект».

**КаМ**

**У аэрапорце? У машыне? У метро?
Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

## Мексіканкі палохалі прэзідэнта голымі

Пяць жанчын з'явіліся голымі ў будынак заканадаўчага сходу Мексікі, патрабуючы адстаўкі прэзідэнта Феліпэ Кальдэрона. Па словах саміх жанчын, яны з'яўляюцца прадстаўнікамі «нацыянальнага грамадзянскага камітэта». Прагнікнуць у будынак ім дапамог апазіцыянер Херарда Фернандэс Нарона.




**АГ**

## Знойдзена скрадзенае цела экс-прэзідэнта

Паліцыі Кіпра ўдалося знайсці выкрадзенае ў мінулым годзе цела прэзідэнта краіны Тасаса Пападопуласа. Яно было знойдзена на могілках у Нікасіі, дзякуючы інфармацыі ананімнай крыніцы. Яшчэ будзе экспертыза ДНК, каб канчаткова пераканацца, што гэта сапраўды парэшткі былога кіраўніка дзяржавы.

Пападопулас займаў пасаду прэзідэнта ад лютага 2003-га да снежня 2008 года, калі памёр ад раку лёгкіх ва ўзросце 74 гадоў. Цела было выкрадзена з магілы на могілках у селішчы Дэфтэра непадалёк ад Нікасіі 11 снежня мінулага года, за суткі да царкоўнай службы ў гадавіну смерці палітыка.

Вінаватыя і матывы злачынства невядомыя, аднак яно было спланаванае і падрыхтаванае. У прыватнасці, злачынцы здолелі падняць 250-кілаграмовую магільную пліту.

Пападопулас у маладосці ўдзельнічаў ва ўзброенай барацьбе супраць брытанскага праўлення на Кіпры і за доўгую кар'еру нажыў мноства ворагаў. У перыяд яго кіравання грэкі-кіпрыёты адкінулі на рэферэндуме прапанаваны ААН план уз'яднання краіны, ухвалены кіпрыётамі-туркамі.



**Бі-Бі-Сі**

**ЗДАРЭННІ**

## Случчакоў, што скралі німб, асудзілі

20-гадовы Ігар Забароўскі атрымаў 4 гады «хіміі», ягоны непаўналетні напарнік Фёдар Базылевіч — два гады ўмоўна.

Асуджаныя сплацяць Свята-Міхайлаўскаму сабору і Слуцкай ЖКГ больш за 7 мільёнаў.

9 сакавіка ў Слуцку скончыўся судовы працэс па справе двух маладых случчакоў, якія спілавалі німб з помніка святой Сафіі Слуцкай і бронзавыя элементы з помніка маршалу Жукаву. Суд даў 20-гадоваму Ігару Забароўскаму 4 гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу (т.зв. «хімію»). Ягоны непаўналетні напарнік Фёдар Базылевіч атрымаў два гады ўмоўна. Асуджаныя сплацяць Свята-Міхайлаўскаму сабору 2,9 млн рублёў і Слуцкай ЖКГ больш за 4,7 млн.

Злачынства, якое мела вялікі розгалас на Случчыне, было здзейснена ў пачатку снежня 2009 г. На той момант аднаму са злачынцаў было 19, а другому — 15 гадоў. Маладых людзей схапілі па гарачых слядах. Скрадзеныя німб ды пліту з помніка Жукаву адшукалі аж но ў Расіі.

**Паводле «Інфа-кур'ер»**



Ігар Забароўскі атрымаў 4 гады «хіміі».



Непаўнагадовы Фёдар Базылевіч — два гады ўмоўна.

### Студэнт выпаў у пралёт

У мінскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі 6 сакавіка памёр студэнт медыцынскага ўніверсітэта. Ноччу малады чалавек упаў у міжлесвічны пралёт шостага паверха інтэрната ВНУ, што на праспекце Дзяржынскага.

### Забіў чалавека цаглінай

Пракуратура Дзяржынскага раёна пачала справу ў дачыненні 22-гадовага бадзягі. Ён быў арыштаваны за разбой і спробу рабаўніцтва. Але пазней высветлілася, што ён яшчэ забіў цаглінай 21-гадовага хлопца, каб забраць куртку і мабільны тэлефон. Труп скінуў у меліярацыйны канал.

### Згарэла на 8 сакавіка

48-гадовая жыхарка вёскі Першамайск Рэчыцкага раёна 8 сакавіка загінула падчас пажару ў сваім доме. Пакуль прыехалі ратавальнікі, аднавяскоўцы згасілі пажар. На ложку ў адным з пакояў яны знайшлі труп гаспадыні. Прычынай пажару магло стаць курэнне ў ложку. Не выключаецца і крымінальны варыянт: труп быў моцна абгарэлы, хаця агонь пашкодзіў невялікую плошчу дома.

### Адкусіў вуха маці

30-гадовы п'яны гамяльчук адкусіў вуха сваёй маці. Па гэтым факце распачатая справа. Гэта не першы такі выпадак у Гомельскай вобласці — у лістападзе 2009 года 24-гадовы жыхар Рэчыцы адкусіў кончык носа падлетку, з якім распачаў бойку. Твар школьніка застаўся скалечаны на ўсё жыццё.

### Па падазрэнні ў двух згвалтаваннях затрыманы 22-гадовы мінчук

Раней не судзімы, нежанаты электразваршчык аднаго са сталічных прадпрыемстваў. Злачынствы былі ўчынены ў сакавіку 2007 года і кастрычніку 2009 года на праспекце Ракасоўскага. Ахвярамі сталі мінчанкі 1983 і 1987 гадоў нараджэння. Не выключаецца, што ён мае дачыненне да іншых падобных злачынстваў.

### У Маскве сумаіст скраў банкамат

У Маскве з крамы прапаў банкаўскі тэрмінал вагой 90 кілаграмаў. Рабаўніку, якім быў прафесійны барацьбіт сумо, не спатрэбілася тэхнічныя прыстасаванні — ён проста выдраў банкамат з падлогі і знёс. На крадзеж яго падманам падбухторылі знаёмы, сказаўшы, што гэты банкамат — ягоны. У банкамаце знаходзілася 25 320 рублёў (850 даляраў). Падазраваным пагражае да 12 гадоў турмы.

**БелаПАН; Postimees.ee**



# Уцячы ад сябе ў Чэхію

## Гісторыя з жыцця гастарбайтэраў. Піша **Зоя С.**

Апошнія сем гадоў Каця займалася глупствам пад назваю «захаванне сям'і». Навошта захоўваць сям'ю, у якой адзін падман і крадзеж грошай для палюбоўніц? Аднак, Каця ўпарта чаплялася за мужа. Прычынай быў паранены жаночы гонар: хацелася перамагчы таемную палюбоўніцу і паказаць ёй кукіш. Муж быў нечым накшталт лялькі, якую Каця хацела мець ля сябе. Яна лічыла яго прыгожым і прыпісвала станоўчыя якасці, якіх ён не меў. Калі сяброўкі крытыкавалі сваіх мужчын, яна катэгарычна заяўляла: «Мой Пеця не такі». А выйшла, што такі і яшчэ «мудрэйшы». Жыў на дзве сям'і і з кожным годам станавіўся нахабнейшы.

Захаванне сям'і скончылася тым, што ў адзін з вечароў муж пачаў біць Кацю, а потым выпіхнуў босую, у адным халаце на лесвічную пляцоўку і зачыніўся ў кватэры. Цяпер яна ўжо не марыла перамагчы палюбоўніцу. Хацела толькі аднаго — пазбавіцца ад мужа.

Пазваніла ў дзверы да суседкі. Сорам апякаў нутро. Папрасіла выклікаць міліцыю. Суседка ўважліва глядзела на яе босыя ногі. Было няўтульна і балюча. Прыйшоў участковы. Сядзеў з посным тварам і глядзеў у адну кропку, слухаючы іх з мужам. «Як вы ўсе мне надакучылі. Яшчэ адзін цырк на маім участку, — нарэшце стомлена сказаў ён. — Ну што, баец, складаем пратакол?» «Не трэба. Я сёння сыду з кватэры», — муж склаў рэчы і з'ехаў да палюбоўніцы.

З жыццём трэба было нешта рабіць, і кардынальнае. На вочы трапілася аб'ява, якая запрашала на працу ў Чэхію. Каця ўхапілася за гэту ідэю, як за ратавальную саломінку. Клопат пра сына адышоў на другі план. «Такі ж эгаіст, як бацька. Васямнаццаць гадоў, а ўсё каб мама падала, прынесла. Няхай цяпер сам пакруціцца», — праносіліся злосныя думкі.

Каця хуценька афарміла ўсе неабходныя дакументы і ў прызначаны дзень прыехала ў чэшскую амбасаду. І тут ледзь не трапіла ў непрыемнасці. Супрацоўніца пасольства, што прымала дакументы, размаўляла па-беларуску. Жанчыны, якія ехалі на працу ў Чэхію, адказвалі ёй па-расійску. Калі падышла Каціна чарга, яна лёгка перайшла на беларускую мову. Аднак супрацоўніца амбасады неспадзявана стала злоснай і агрэсіўнай, нават не хацела даваць візу. Каця стаяла як абвараная. Візу ўсё ж далі, але застаўся непрыемны ўспамін.

Усяго на працу ў Чэхію ехалі дваццаць жанчын сярэдняга веку. Большая частка з Брэстчыны. Яны ўжо прызвычаіліся да заробкаў у Еўропе. Ехалі моўчкі, прыглядаліся адна да адной. У Чэхіі іх размясцілі ў інтэрнаце. У Каці былі дзве суседкі. З адной адразу пасябравалі. Звалі яе Наталля. Другая трымалася адасоблена. Было ёй каля 30 гадоў. На заробкі яна прыехала з поўным чамаданам рознакаляровых пеньюараў...

Першы дзень працы выдаўся незвычайным. Як толькі жанчыны выйшлі ў поле садзіць салатную расаду, з'явілася кампанія мужчын-румынаў. Яны пасталі воддаль і пачалі разглядаць працаўніц, весела перагаворваючыся. Было відаць, што да прагляду мужчыны рыхтаваліся. Былі акуратна паголеныя і прыбраныя.

Жанчыны пачалі рагатаць. Нехта пажартаваў: «Можа, яшчэ песню запяём, каб хлапцам спадабацца?» Румыны ў чэшскай аграфірме працавалі ўжо дзесяць гадоў, а жанчыны-беларускі прыехалі ўпершыню. Вось яны і прыйшлі паглядзець на гэта дзіва. Першае румына-беларускае знаёмства было на ўзроўні смеху. Ніхто нікога не разумеў — мовы вельмі розныя. З'явілася начальства, і румыны сышлі на сваю дзялянку. А жанчыны яшчэ цэлы дзень смяяліся з апошніх падзеяў.

Пад вечар стомленыя працаўніцы прыйшлі ў душ. Першыя падоўгу стаялі пад цёплым і прыемным ручайком, атрымлівалі асалоду. Яшчэ не памылася і палова, як гарачая вада ў тытане скончылася. Астатнія мыліся халоднай, злуючыся на папярэдніц. На наступны дзень сітуацыя паўтарылася. На трэці дзень аматаркі гарачага душу першымі прыбеглі мыцца і хацелі зноў надоўга засесці ў душавой. Тады астатнія ўзламалі зашчэпку душавой кабінкі і выцягнулі адну голую і мокрую памыўшчыцу ў калідор. Яна вішчала, аднак ніхто не звяртаў увагі. Тады тая перайшла на плаксівы тон:

— Я грэла спіну гарачай вадой. У мяне хворыя ныркі.

— Дома будзеш лячыць свае ныркі. Чаго сюды прыехала? Хворая — валі назад у Беларусь.

— Здаровых знайшла, — пачалі абурацца іншыя, кожны падумаў пра свае болькі. — Мы ўсе былі хворыя, а тут паправіліся.

Астатнія памыўшчыцы самі павыскоквалі з душавых кабінак, баючыся, што і ім перападзе. Чарга пайшла хутка. На гэты раз гарачай вады хапіла ўсім. Стала зразумела — расслабляцца не прыйдзецца.

Пачаліся цяжкія працоўныя будні. Праз месяц штаны на Каці ледзь трымаліся. Таўстухам праца пайшла на карысць. Яны папрыгажэлі. Худзенькія — сталі падобныя да шкілетаў, і Каця ў тым ліку. Ежу гатавалі румыны: чорбы (румынскія супы), тушаныя перцы, яйкі смажаныя плаваюць у алеі і г.д. Для беларусак падобнае харчаванне было нязвыклым. Каця сядзела галодная. Вечарам, купіўшы булак, даядала ў сваім пакойчыку. Трэ было трымацца. Прадпрыемства прыватнае, і кіраўніцтва пільна сачыла за тым, як хто працуе. Праз два месяцы трох жанчын разлічылі і адправілі дадому. Астатнія яшчэ старанней узяліся за працу.

Зайздросцілі ўкраінцам. Тыя самі хацелі прыязджалі, хацелі — ад'язджалі. Ведалі ўсе хады-выхады. Паводзілі сябе вольна. Ніякіх кантрактаў. Чэхаў тут амаль не было. Іх праца ў аграфірме не прываблівала. Аднойчы Каця завяла размову з прадавачкай крамы. Маладая дзяўчына-чэшка сказала, што зарабляе 300 еўра ў краме, але працаваць у аграфірму за 600 еўра ніколі не пойдзе, бо вельмі цяжкая праца. Гэта было праўдай. Румыны, што працавалі тут ад пачатку ўтварэння фірмы, выглядалі змучанымі. Тыя, каму было па сорак гадоў, выглядалі на ўсе пяцьдзесят.

Наогул, румыны трымаліся асобна, працавалі сем'ямі, чужых да сябе не пускалі. Нават землякоў. Аднойчы на працу прыехаў малады румын. Гадоў васямнаццаць — не больш. Працаваў ён старанна. Аднак праз два тыдні суайчыннікі звінавацілі яго ў крадзяжы 100 еўра. Ніхто не паверыў. Было відавочна, што яны хочуць пазбавіцца ад чужака. Хлопец з'ехаў.

Прайшло тры месяцы. Каця прызвычаілася да працы, ужо не так стамлялася, нават выбіралася з жанчынамі на танцы ў бліжэйшы гарадок. У яе з'явіўся кавалер. Італьянец, супрацоўнік кіраўніцтва аграфірмы. Каб неяк кантактаваць, яна вучыла італьянскую мову, хутка і паспяхова. Выходзіла так, што беларусы больш падрыхтаваныя да кантакту з еўрапейцамі. Акрамя кірыліцы, Каця ведала і лацінскі шрыфт. Для яе ж новага знаёмага Сільвіа славянскія мовы і кірыліца былі як цёмны лес. Заходнія еўрапейцы варацца ва ўласным катле і пра славянскі свет амаль нічога не ведаюць. Але, калі казаць пра адносіны мужчын і жанчын, то чым менш яны размаўляюць, тым лепш разумеюць адзін аднаго. У Кацярыны пачаўся бурны раман. Усё б добра, каб не адна дэталь: ён быў жанаты і не хаваў гэтага. Ёй жа адводзілася роля палюбоўніцы, і гэта Кацю задавальняла. Дзіўны народ — жанчыны. Некалі змагалася з каханкай мужа, а цяпер і сама такой стала. Можа, хацела прымераць на сябе гэты вобраз? Наташа, суседка па пакоі, яе пытала: «Кацярына, навошта табе жанацік? Не будзе з яго толку».

— Затое са Свецінага Мыколы-ўкраінца будзе толк, — прыпомніла яна іх супольную знаёмую.

— А што Мыкола? Добры хлопец. Халасцяк.

— Халасцяк. Прыйдзе да нас Свету шукаць і пытаецца: «Дзе тут мая малпа?» Сёння малпа, а заўтра хто? Не, я хачу рамантычных адносінаў. Ты лепш спытала б, дзе суседка з нашага пакоя швэндае?

Сапраўды, іх маўклівая суседка кожны выхадны з'язджала ў невядомым накірунку. Часам прагульвала работу. За прагул яе штрафавалі. Яна выплачвала штраф і зноў выпраўлялася ў паездкі. А раз ноччу, калі ўсе спалі, маўклівая суседка проста збегла з інтэрната. Гэта было за месяц да ад'езду ў Беларусь. А месяцам раней ва ўцёкі падаліся тры сяброўкі, якіх на працу пераманіла фірма-канкурэнт. Пакваліся на абяцаныя залатыя горы, а трапілі ў пастку. Уцёкшы са сваёй аграфірмы, яны страцілі кантракт і апынуліся на нелегальным становішчы. Ім амаль нічога не плацілі. Абхітрылі саміх сябе.

Каця праводзіла ўвесь вольны час са сваім Сільвіа. Гуляла па ваколіцах, абедала ва ўтульных рэстаранчыках. Толькі цяпер заўважыла, што Чэхія вельмі прыгожая краіна. Чароўная прырода. Акуратныя цагляныя дамкі, ля якіх у палісадніках квітнеюць ружы. Прыязныя людзі. Хацелася больш даведацца аб гэтай краіне. Але на экскурсіі далёка не паедзеш, усяго адзін выхадны.

Пад канец сезона праца стала лягчэйшая. Збіралі яблыкі. Часам праходзілі дажджы, прыносілі дадатковы выхадны . Жанчыны патроху збіраліся дамоў і абмяркоўвалі сваё чэшскае жыццё. Бальшыня схілялася да таго, што іх тут страшэнна эксплуатавалі, мала плацілі і на іх мазалях будавалі дабрабыт аграфірмы. Аднак, калі прыйшоў час падпісваць кантракт на наступны год, усе як адна яго падпісалі. Каця абурылася: «Калі вам тут дрэнна, навошта едзеце на наступны год?»

— Кацярына, дай людзям пару выпусціць. Яны стаміліся, спіну ломіць. Хто вінаваты?

— Эксплуатататары, — супакойвала суседка Наташа.

На самой справе, усе былі задаволены. Зарабілі грошы ды хутка будуць дома...

І вось Каця сядзіць у сваёй кватэры ў беларускім райцэнтры. Сумны вечар. За акном — снег. Пройдзе зіма, і Каця зноў прыедзе у Чэхію, каб збегчы ад рэальнасці. У чужой краіне яна будзе зарабляць грошы і красці чужое каханне. Але калісьці ёй прыйдзецца вярнуцца ў рэальнае жыццё. Якім яно будзе, гэта вяртанне?

*Мінск*

# «Рок-карона» ў «Без білета», але шоу скралі Кулінковіч і Вайцюшкевіч

**«Не ведаю, хто там будзе выступаць потым, але разагравае іх «Ляпіс Трубяцкі», — сказаў адзін з рок-аматараў на подступах да клуба «Рэактар», дзе адбывалася «Рок-каранацыя-2009».**

Сапраўды канцэрт адкрываў САМ: рок-кароль-1997 і 2008 Сяргей Міхалок. Сёлета ён зарабіў толькі адну малую карону ў намінацыі «найлепшая песня» — за «Ружовыя акуляры». Але якраз яе Міхалок не спяваў, абмежаваўся «Рамонкамі» і каверам на песню класікаў панк-рока Ramones. У дадатак дэкламаваў вершы Купалы і Маякоўскага.

Увогуле, на «Рок-каранацыі-2009» усе стараліся размаўляць па-беларуску. Пад ціскам залы на палове сказа перайшоў на беларускую нават «знаток» Алесь Мухін, які ўручаў галоўную рок-карону. Нават антыгероі нядаўняга скандалу — маладыя рокеры The Toobes, якія заявілі колькі тыдняў таму, што не разумеюць па-беларуску, пачалі адольваць моўныя азы. Пасля атрымання кароны за «дэбют года» і словаў Аксаны Вечар: «Яны маюць усё, акрамя ведання беларускай мовы», саліст The Toobes Стас нарэшце вымавіў: «Вельмі прыемна».

Па-беларуску не гаварылі толькі ўдзельнікі калектыву «Князь Мышкін» (рок-карона за адданасць жанру) — яны ўвогуле не гаварылі, бо былі цалкам засяроджаныя на сваіх медытатыўных ушчыпваннях электрагітарных струн і рэгуляваннях тагасветнага камп'ютарнага шумавіння. Усё гэта гучала як гарадскі варыянт «Тройцы». Жывому ж папулярызатару белмовы ў рокавых дыяпазонах, музычнаму парталу «Тузін Гітоў» з яго альбомам «Перазагрузка» (там расійскамоўныя творцы перапяялі свае гіты па-беларуску), нават далі «Праект года».

«Нестандартны варыянт» (яны атрымалі новую намінацыю «Рэп-праект года») выканаў свой хіт «У неба» і рэмікс на NRMаўскі «Паветраны шар». Дарэчы, дух адсутнага бацькі NRM лунаў панад «Рок-каранацыяй-2009». Гурт на гэтай адсутнасці нават зарабіў: Вольскі і К атрымалі рок-карону за самы паспяховы канцэрт года: маецца на ўвазе нядаўняя акустыка ў КЗ «Мінск» — пасля доўгага перапынку і з поўным аншлагам.

Калі вядоўца «Каранацыі» Алег Хаменка пачаў сыпаць словамі «пачэсны» і «ганаровы», «уклад у развіццё рок-музыкі» і «спадчына», усе зразумелі, што зараз на сцэну выйдзе хтосьці, абвешаны рэгаліямі і старэнькі. Але не ведалі, што нагэтулькі!



ЮРЫЙ СІДУН

На сцэну вывалілі з сівой барадзішчай а-ля ZZ-Top (прабачце, дзед-Барадзед) Аляксандр Кулінковіч і яшчэ адзін саліст Neurodubel'я Юры Навумаў, шырока вядомы як «Паскуда», — таксама з накладной «амерыканкай». Яны па-стара-добраму ўсыпалі рок-н-рольнага перцу з імберцам. Дзяды, кажаце? Унёсак у бел-рок, гаворыце? Neurodubel зноў давёў, што хаваць іх зарана.

«Крама» ўзяла намінацыю «Традыцыі і сучаснасць», якая зазвычай даецца фолк-гуртам, ды атрымала ад грамадскай кампаніі «Будзьма беларусамі!» акарыну, старадаўні інструмент, відаць, для рытм-энд-блюзавых практыкаванняў па-старабеларуску.

Вайцюшкевіч зайшоў з задняга ходу. Атрымаўшы карону як найлепшы выканаўца года, ён нагадаў публіцы, што «не рокам адзіным». І як! Выйшаўшы з адной гітарай і, шматкроць спыняючы напеў дзеля рытарычных пасажаў, прапяяў-прагаварыў пару новых шансонаў (у харошым, французскім, сэнсе гэтага слова). Прагучала новая песня «Беларускі мужчына» на словы Андрэя Хадановіча. Ці то ад праўды-матухны пра беларускага мужчыну, у якога «дзед перажыў індустрыялізацыю, бацька — прыватызацыю, а кот — кастрацыю», ці то ад нечаканага выгіну рок-канцэрта, публіка захоплена заскавытала.

Выбар гурта года, альбома года і, адпаведна, уладальніка галоўнай рок-кароны, пэўна, быў абумоўлены зацягнутай зімой.

Бо цэльны «Культпрасвет» «Ляпіса» і яскравы дэбютнік The Toobes — Hello! не саступалі пераможцу — гурту «Без білета» з ягонай «Афрыкай». Але яўна замала ў іх было сонечнай атмасферы і афрыканскага каларыту.

«Паколькі ў свеце наша краіна вядомая сваёй дэпрэсіяй — тут па тры месяцы не бывае сонца,— дык мы павінны мець тое сонца знутры», — патлумачыў сваю зацікаўленасць афрыканскай тэматыкай лідэр безбілетнікаў і рок-кароль-2009 Віталік Артыст.

Амаль пяцігадзінны канцэрт закончыўся спяваннем гімна ўсіх часоў і аднаго народа «Мая краіна Беларусь». Гэты канцэрт — яўны прэтэндэнт на «рок-карону» за найлепшы канцэрт ужо 2010 года.

**Павал Касцюкевіч**

## Mauzer: Маіх лажаў было больш

Пасля скандальнага канцэрта ў мінскім клубе «Рэактар» на пытанні «НН» адказвае Янка Маўзер, вакаліст гурта Mauzer.


КАСТУСЬ МАТУШЫЧ

**«Наша Ніва»: Чаму гурт так нечакана пакінулі адразу два музыкі?**

**Янка Маўзер:** Сыход басіста мы прадбачылі. Наконт бубнача мы нічога не ведалі. Такі таямнічы чалавек аказаўся. Яны разам з'ехалі ў піцерскі гурт I.O.W.A. Там плацяць больш.

**«НН»: У інтэрнэце ўжо з'явілася інфармацыя, што і ты можаш пакінуць Магілёў, каб працягнуць кар'еру ў Расіі.**

**ЯМ:** Такі варыянт не разглядаецца.

**«НН»: Янка, нагу насамрэч зламаў, ці гэта проста піяр такі?**

**ЯМ:** Я не ведаю, чаму гэта ўспрынялі як піяр. Чаму цяжка зразумець, што калі спатрэбілася б нешта выдумаць, каб адтрындзецца, я прыдумаў бы нешта прасцейшае. Я на рэпетыцыі падскочыў і няўдала прызямліўся. Нага забалела. Пайшоў да лекара. Здымак паказаў пералом плюсневай косткі. Доктар сказала, што абломак косткі знаходзіцца побач з суставам. І калі ён трапіць у сустаў, то неабходная будзе аперацыя. Пагадзіліся на эластычны бінт.

**«НН»: Якія ўражанні ад акустычнага выступу?**

**ЯМ:** Мы ж не акустычны гурт. Я — не гітарыст. І маіх лажаў было больш. Але ўсё было душэўна. Народ падтрымліваў нас.

**Гутарыў Кастусь Матушыч**

## «Аватар» у пралёце

**Ваенная драма пра вайну ў Іраку «Уладар буры» прызнаная найлепшым амерыканскім фільмам 2009-га года.**


**«Уладар буры»: 6 «Оскараў».**


**Джэф Брыджыс.**


**Сандра Балак.**

У Лос-Анжэлесе адбылася 82-я цырымонія ўручэння прызоў амерыканскай кінаакадэміі «Оскар».

Найлепшай рэжысёркай прызнаная Кэтрын Бэгілоу за ваенную драму «Уладар буры». У дадатак яна зрабілася першай жанчынай у гісторыі Галівуда, якая атрымала гэтае званне. Усяго стужка, якая сабрала ў пракаце толькі 11 мільёнаў даляраў, заваявала аж шэсць «Оскараў», у тым ліку самую прэстыжную — «Найлепшая стужка». Падчас атрымання ўзнагародаў стваральнікі паабяцалі, што запусцяць свой фільм у пракат яшчэ раз.

Найлепшым акторам прызнаны Джэф Брыджэс, што сыграў старога алкаголіка, выканаўцу кантры, якому каханне дапамагае адкрыць свой свет наноў (драма «Шалёнае сэрца»).

Сандра Балак — найлепшая акторка, паводле амерыканскай кінаакадэміі, за ролю прыёмнай маці, якая змагаецца за свайго чарнаскурага пасынка (сацыяльная драма «Нябачны бок»).

Прыз за найлепшую ролю другога плана атрымаў аўстрыйскі актор Крыстаф Вальц, які гратэскна сыграў крыважэрнага нацысцкага палкоўніка, паляўнічага на габрэяў, у кінаманскай фантазіі Квенціна Таранціна «Бясслаўныя байструкі». Найлепшая акторка другога плана — актрыса Монік, якая грае жыхарку мурынскага гета, што за асабістыя няўдачы бэсціць і прыніжае сваю цяжарную дачку (драма «Выжывайся»).

Найлепшым поўнаметражным мультфільмам была прызнаная стужка канкурэнта «Дыснэя», кампаніі «Піксар», — «Угору» («Up»). Гэта шчымлівая гісторыя для дзяцей і дарослых пра тое, як важна спраўджваць мары.

У намінацыі «Найлепшы кароткаметражны мастацкі фільм» выйграла нямецкая карціна «Новыя жыхары». На гэтае званне прэтэндаваў і ірландскі фільм Хуаніты Уілсан «Дзверы», зняты паводле апавядання Святланы Алексіевіч пра наступствы Чарнобыльскай трагедыі.

А «Аватар»? Яго стваральнікі атрымалі прыз за «найлепшую аператарскую працу» (Мауро Фіёры), «Найлепшыя адмысловыя эфекты», «Найлепшая праца мастака». І мільярды ў пракаце, вядома.

Цырымонію ўручэння ўпершыню ў жывым эфіры паказвала БТ.

**Ліза Кавальчык**

## «Дзеяслоў» перайшоў на школьны правапіс

З'явіўся чарговы №44 часопіса «Дзеяслоў». З 2010 года ён выдаецца згодна са школьным правапісам. Гэта нумар «незакончаных» твораў. У ім друкуюцца пачаткі раманаў Леаніда Дайнекі «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка», пачатак драмы Уладзіміра Някляева «Армагедон». Нумар яшчэ і юбілейны. У студзені-лютым 70-годдзе сустрэў Леанід Дайнека, 75-годдзе — Рыгор Барадулін (друкуюцца яго вершы). А Валянцін Тарас мог бы адзначыць сёлета свой 80-ы дзень нараджэння. Бацьку прысвечана публікацыя Віталя Тараса. Апавяданнем «Ліза» дэбютаваў у часопісе Франак Вячорка.

**КМ**

# Адрынутая рэальнасць Халакоста

Эпіцэнтр масавых забойстваў сярэдзіны XX стагоддзя ляжыць у Беларусі, Украіне, Польшчы і балтыйскіх дзяржавах — на тэрыторыі, якую і Гітлер, і Сталін хацелі расчысціць для рэалізацыі эканамічных праектаў. Піша гісторык **Цімаці Снайдэр**.

Бюракратычныя апараты нацысцкай Германіі і Савецкага Саюза ператварылі асобныя жыцці ў масавую смерць, асобных людзей — у квоты прызначаных на вынішчэнне. Саветы хавалі сляды масавых забойстваў у цёмных лясах і фальсіфікавалі звесткі па раёнах, дзе марылі людзей голадам. Немцы прымушалі зняволеных выкопваць целы забітых яўрэяў і паліць на гіганцкіх вогнішчах. Гісторыкі мусяць праліць святло на цені гэтых людзей і палічыць іх. Гэта яшчэ не зроблена.

Аўшвіц, які лічыцца на Захадзе сімвалам масавых забойстваў, — на самай справе ўвасабляе толькі малую іх частку. Гісторыя, напісаная тымі, хто выжыў у Аўшвіцы — самым вядомым узорам яе з’яўляецца спадчына Прыма Леві, — адлюстроўвае падзеі неадэкватна. Вядомы «Дзённік Ганны Франк» апісвае асіміляваныя яўрэйскія супольнасці — галандскую і нямецкую. Да апісаных там 1943—1944 гадоў, калі адбывалася знішчэнне заходнееўрапейскіх яўрэяў, Халакост быў амаль завершаны. Дзве траціны яўрэяў — ахвяраў Другой сусветнай — былі мёртвыя да канца 1942 года.

Адэкватнае бачанне Халакоста паставіла б у цэнтр яго гісторыі аперацыю «Рэйнхард» — знішчэнне польскіх яўрэяў у 1942 годзе. Польская яўрэйская супольнасць была найбуйнейшай у свеце, а Варшава — найважнейшым яўрэйскім горадам. Гэтую супольнасць знішчалі ў Трэблінцы, Бельзаку і Сабіборы. У гэтых трох канцлагерах было забіта паўтара мільёна яўрэяў, 780 863 загінулі толькі ў адной Трэблінцы. Выжыла ўсяго некалькі дзясяткаў чалавек. Бельзак, трэцяе паводле значэння пасля Аўшвіца і Трэблінкі месца масавых забойстваў у гісторыі Халакоста, застаецца амаль невядомым. На гэтай фабрыцы смерці загінулі 434 508 яўрэяў, а ў жывых засталіся толькі двое ці трое. Яшчэ каля мільёна польскіх яўрэяў былі закатаваныя ў Хэлмне, Майданку, Аўшвіцы, а яшчэ большую колькасць расстралялі падчас акцый ва ўсходняй палове тагачасных польскіх тэрыторый (у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне — Рэд.).

Масавыя расстрэлы ва ўсходняй Польшчы і Савецкім Саюзе з’яўляюцца другім паводле значэння складнікам Халакоста. Пачаліся яны з расстрэлаў яўрэйскіх мужчын эсэсаўскімі айнзацгрупамі ў чэрвені 1941 года, у ліпені пашырыліся на яўрэйскіх жанчын і дзяцей, а ў жніўні і верасні таго ж года прывялі да поўнага вынішчэння тамтэйшых яўрэйскіх супольнасцяў. На канец 1941 года немцы (з мясцовымі памагатымі і румынскімі войскамі) знішчылі ў Савецкім Саюзе і балтыйскіх краінах мільён яўрэяў. Да канца 1942 года немцы расстралялі (зноў-такі пры немалым спрыянні мясцовых жыхароў) на падкантрольных савецкіх землях яшчэ 700 тысяч яўрэяў, і мясцовыя яўрэйскія супольнасці перасталі існаваць.




**Пад маркай антыпартызанскіх акцый немцы забілі амаль тры чвэрці мільёна чалавек — каля 350 тысяч толькі ў Беларусі.**

Сярод савецкіх яўрэяў пра гэта маглі расказаць сведкі і летапісцы — такія, як Васіль Гросман. Аднак яму і іншым забаранілі прадстаўляць Халакост як выразна яўрэйскую падзею. Гросман дапамагаў у складанні «Чорнай кнігі» нямецкіх злачынстваў супраць савецкіх яўрэяў, якую савецкая прапаганда пазней забараніла. Калі, ілжыва сцвярджаў Сталін, нейкая група і пацярпела ад немцаў асабліва, дык гэта былі расійцы.

«Канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання» было толькі адным са знішчальных праектаў, якія нацысты планавалі ажыццявіць пасля пераможнай вайны супраць Савецкага Саюза. Калі б усё здарылася так, як разлічвалі Гітлер, Гімлер і Герынг, узімку 1941—1942 гадоў нямецкія войскі ажыццявілі б у Савецкім Саюзе «План голаду» («Hungerplan»). Пасля вывазу ў Германію ўкраінскай і паўднёварасійскай сельгаспрадукцыі ў Беларусі і паўночнай Расіі павінны былі б памерці з голаду каля 30 мільёнаў чалавек. «Hungerplan» быў прэлюдыяй да «Generalplan Ost» — плана каланізацыі заходняй часткі Савецкага Саюза, які прадугледжваў знішчэнне каля 50 мільёнаў чалавек.

Вермахт мэтанакіравана замарыў голадам каля мільёна чалавек падчас блакады Ленінграда і яшчэ пад сто тысяч чалавек ва ўкраінскіх гарадах. Каля трох мільёнаў палонных савецкіх салдат загінулі ад голаду і хвароб у нямецкіх лагерах. Іх знішчылі наўмысна.

Калі б не было Халакоста, гэтыя падзеі сёння згадвалі б як найстрашнейшае ваеннае злачынства найноўшай гісторыі.

Пад маркай антыпартызанскіх акцый немцы забілі амаль тры чвэрці мільёна чалавек — каля 350 тысяч толькі ў Беларусі. Калі б Халакоста не было, гэтыя «меры ў адказ» сёння таксама разглядалі б у шэрагу найбольшых ваенных злачынстваў у гісторыі. Але іх — як і замораных голадам савецкіх ваеннапалонных — амаль не згадваюць за межамі краін, якіх гэта непасрэдна датычылася.

**У забойчай палітыцы сталінізму найважнейшымі былі два моманты — калектывізацыйныя голады 1930—1933 гадоў і Вялікі Тэрор 1937—1938 гадоў.**

Падчас масавых знішчэнняў немцы забілі больш як дзесяць мільёнаў мірных грамадзян — яўрэі складалі прыкладна палову з іх. І яўрэі, і неяўрэі паходзілі пераважна з адной часткі Еўропы. Праект вынішчэння яўрэяў быў у цэлым ажыццёўлены; праект вынішчэння славянскага насельніцтва выкананы толькі часткова.

Аўшвіц быў толькі ўступам да Халакоста, Халакост — толькі намёкам на канчатковыя намеры Гітлера. Гросманавы раманы «Усё цячэ» і «Жыццё і лёс» смела апісваюць як нацысцкі, так і савецкі тэрор ды нагадваюць нам, што нават поўная характарыстыка нямецкай палітыкі масавых забойстваў — гэта няпоўная гісторыя злачынстваў, што адбываліся ў Еўропе ў сярэдзіне XX стагоддзя. Бо такая характарыстыка абмінае дзяржаву, пра знішчэнне якой Гітлер дбаў найперш, і якая ў сярэдзіне стагоддзя таксама масава знішчала еўрапейцаў, — Савецкі Саюз. За ўвесь сталінскі перыяд, ад 1928 да 1953 года, савецкая палітыка знішчыла, паводле прыблізных ацэнак, звыш пяці мільёнаў еўрапейцаў.

Савецкія рэпрэсіі атаясамліваюць з ГУЛАГам. Але ГУЛАГ, пры ўсім жаху рабскай працы, не быў сістэмай масавага забойства. Ён быў сістэмай працоўных лагераў. Праз ГУЛАГ прайшло каля 30 мільёнаў чалавек, амаль тры мільёны з іх там засталіся. Але пераважная большасць вярнуліся жывымі.

У забойчай палітыцы сталінізму найважнейшымі былі два моманты: калектывізацыйныя голады 1930—1933 гадоў і Вялікі Тэрор 1937—1938 гадоў. Застаецца незразумелым, ці наўмысным быў казахскі голад 1930—1932 гадоў, калі загінула больш за мільён казахаў. Устаноўлена, што Сталін узімку 1932—1933 гадоў мэтанакіравана марыў голадам украінцаў.

Дакументы ўтрымліваюць шэраг загадаў, датаваных кастрычнікам-снежнем 1932 года, з відавочнымі зламыснымі намерамі забіць. У выніку загінулі больш як тры мільёны жыхароў Савецкай Украіны.

Найбуйнейшая акцыя Вялікага Тэрору, аперацыя 00447, была накіравана супраць «кулакоў», г. зн. сялян, якія ўжо зведалі ўціск падчас калектывізацыі. Гэтая аперацыя забрала 386 798 жыццяў. З некалькіх нацыянальных меншасцяў паходзіць больш як трэць закатаваных у Вялікім Тэроры. Так, у акцыі, скіраванай супраць этнічных палякаў, што былі грамадзянамі Савецкага Саюза, было расстраляна 111 091 чалавек. З 681 692 пакараных смерцю ў 1937 і 1938 гадах нібыта за палітычныя злачынствы аперацыі супраць кулакоў і «нацдэмаў» забралі 633 955 жыццяў — больш як 90%. Гэтыя людзі былі ўпотайкі расстраляныя, пахаваныя ў ямах і забытыя.

**Геаграфічны, маральны і палітычны цэнтр масавых еўрапейскіх забойстваў ляжыць ва Усходняй Еўропе, перш за ўсё ў Беларусі, Украіне, Польшчы і балтыйскіх дзяржавах — краінах, што пацярпелі ад шматгадовай злачыннай палітыкі абодвух рэжымаў.**

Акцэнт на Аўшвіцы і ГУЛАГу перасоўвае геаграфічны эпіцэнтр забойстваў у Трэці Рэйх і на расійскі Усход. Але паміж 1933 і 1944 гадамі амаль 12 мільёнаў ахвяр нацысцкай і савецкай палітыкі загінулі ў рэгіёне Еўропы, які прыблізна супадае з сённяшнімі землямі Беларусі, Украіны, Польшчы, Літвы і Латвіі.

Геаграфічны, маральны і палітычны цэнтр масавых еўрапейскіх забойстваў ляжыць у краінах, што пацярпелі ад шматгадовай злачыннай палітыкі абодвух рэжымаў.

Народы Украіны і Беларусі — перш за ўсё яўрэі, але не толькі яны — пацярпелі найбольш,

**Цімаці Снайдэр**

(Timothy Snyder, нар. 1969) амерыканскі гісторык. Доктар гістарычных навук. Выкладае ў Ельскім універсітэце (ЗША). Аўтар шматлікіх публікацыяў і манаграфіяў, прысвечаных гісторыі Усходняй Еўропы.

бо гэтыя землі і належалі да Савецкага Саюза ў страшныя трыццатыя гады і перажылі найстрашнейшыя нямецкія рэпрэсіі ў саракавых гадах. Калі Еўропа была, кажучы словамі Марка Мазовера, змрочным кантынентам, то Украіна і Беларусь — сэрцам змроку.

Цяжка не згадаць Ганну Ахматаву: «Любит, любит кровушку русская земля». Аднак расійскае пакутніцтва і геразім, якія сёння гучна ўслаўляюцца ў пуцінскай Расіі, варта супаставіць з гістарычным фонам.

**У Расіі падчас вайны ад рук немцаў загінуў прыкладна кожны дваццаць пяты мірны жыхар, тады як ва Украіне (ці Польшчы) — кожны дзясяты, а ў Беларусі — кожны пяты.**

Расійцы, як і іншыя савецкія грамадзяне, сапраўды былі ахвярамі сталінскай палітыкі, але для іх імавернасць загінуць была намнога меншая, чым для савецкіх украінцаў, савецкіх палякаў ці прадстаўнікоў іншых нацыянальных меншасцяў.

22 тысячы польскіх грамадзян у 1940 годзе былі расстраляны ў Катыні і чатырох іншых месцах; дзясяткі тысяч палякаў і прыбалтаў памерлі падчас дэпартацый у Казахстан і Сібір.

У Расіі падчас вайны ад рук немцаў загінуў прыкладна кожны дваццаць пяты мірны жыхар, тады як ва Украіне (ці Польшчы) — кожны дзясяты, а ў Беларусі — кожны пяты.

Перабольшаныя расійскія ацэнкі колькасці смерцяў вынікаюць з залічэння Беларусі і Украіны да Расіі, а беларусаў і ўкраінцаў — да расійцаў; гэта зводзіцца да імперыялізму пакутніцтва: прэтэнзіі на землі выказваюцца праз прэтэнзіі на ахвяр. Мабыць, акурат такой будзе пазіцыя гістарычнай камісіі, заснаванай прэзідэнтам Дзмітрыем Мядзведзевым і закліканай процістаяць «фальсіфікацыі» расійскай мінуўшчыны.

Калі нейкая еўрапейская краіна падаецца недарэчнай у сённяшняй Еўропе і затрыманай у іншым гістарычным часе, дык гэта Беларусь пад дыктатурай Аляксандра Лукашэнкі. Аднак Лукашэнка, хоць ён лічыць за лепшае ігнараваць месцы савецкіх забойстваў у сваёй краіне, загадваючы будаваць магістраль праз месца масавых пахаванняў у Курапатах, у нейкім сэнсе памятае гісторыю Еўропы лепш за сваіх крытыкаў.

Нямецкія войскі ў 1941—1944 гадах, морачы голадам савецкіх ваеннапалонных, душачы газам яўрэяў, расстрэльваючы мірных жыхароў падчас антыпартызанскіх акцый, ператварылі Беларусь у мясцовасць з найвышэйшай смяротнасцю ў свеце. Палова жыхароў Савецкай Беларусі на працягу Другой сусветнай вайны былі забітыя ці гвалтам выселеныя; нічога падобнага нельга сказаць ні пра адну іншую еўрапейскую краіну.

Беларуская памяць гэтага досведу, якую песціць сённяшні дыктатарскі рэжым, дапамагае растлумачыць падазронае стаўленне да ініцыятыў, што паходзяць з Захаду. Аднак заходнія еўрапейцы маглі б са здзіўленнем даведацца, што Беларусь адначасова была цэнтрам масавых забойстваў і аператыўнай базай антынацысцкіх партызан, якія сапраўды ўнеслі прыметны ўклад у перамогу саюзнікаў. Уражвае, што такая краіна можа быць цалкам выцесненая з еўрапейскай памяці. Адсутнасць Беларусі ў абмеркаваннях мінулага — гэта найбольш яўнае сведчанне розніцы паміж памяццю і гісторыяй.

Непакоіць адсутнасць у гэтых абмеркаваннях і эканомікі. Памяць адкідае любыя сведчанні таго, што можа надаць забойствам ганебную рацыянальнасць. І нацысцкая Германія, і Савецкі Саюз шукалі шляхоў да эканамічнай самадастатковасці. Германія прагнула знайсці раўнавагу паміж прамысловым развіццём і сельскагаспадарчай утопіяй на Усходзе, СССР імкнуўся перадолець аграрную адсталасць хуткай індустрыялізацыяй і ўрбанізацыяй. Абодва рэжымы намагаліся дасягнуць эканамічнай аўтаркіі ў рамках вялікай імперыі, у якой абодва прагнулі кантраляваць Усходнюю Еўропу. Абодва лічылі польскую дзяржаву гістарычнай памылкай; абодва не бачылі альтэрнатывы Украіне і яе ўрадлівым глебам.

І ў саветаў, і ў нацыстаў ідэалогія, якая ўзаконьвала масавую смерць, была перадумовай эканамічнага развіцця. У святле недахопу рэсурсаў, асабліва харчавання, абодва рэжымы паяднаў масавае забойства з эканамічным планаваннем.

Зрабілі яны гэта спосабамі, якія сёння падаюцца нам жахлівымі, але якія ў часы свайго ажыццяўлення былі дастаткова пераканаўчымі, каб матываваць вялікую колькасць прыхільнікаў. Сёння ежы ўжо хапае, прынамсі на Захадзе. Але ў XXI стагоддзі нас напаткае нястача пітной вады, чыстага паветра і таннай энергіі. Змены клімату могуць выклікаць новую пагрозу голаду.

Калі гісторыя масавых забойстваў і нясе ў сабе нейкі агульны палітычны урок, то ён заключаецца ў неабходнасці асцерагацца таго, што можна назваць прывілеяваным развіццём, г. зн. спроб розных дзяржаў ажыццявіць форму эканамічнай экспансіі, якая прызначае ахвяр і матывуе дабрабыт смяротнасцю.

Нельга выключаць, што знішчэнне адной групы прынясе выгаду іншай. Гэтую версію палітыкі Еўропа ўжо бачыла і можа яшчэ ўбачыць. Адзіным дастаковым адказам будзе этычная адданасць асобнаму чалавеку, паводле якой чалавек важны менавіта пакуль ён жывы.

Сённяшняя Еўропа вылучаецца спалучэннем дабрабыту з сацыяльнай справядлівасцю і правамі чалавека. Таму яна зараз больш устойлівая за нейкую іншую частку свету перад такімі бессардэчна інструментальнымі пошукамі эканамічнага росту. Але памяць зрабіла некалькі дзіўных адступленняў ад гісторыі акурат тады, калі гісторыя патрэбная як ніколі. Нядаўняя мінуўшчына Еўропы можа нагадваць недалёкую будучыню астатняга свету.

Каб гэта перадухіліць, трэба пазбавіцца памылак у падліках.

**Публікуецца са скарачэннямі.**
**Пераклад СП**



# Правінцыйная бацыла

**Так, Купала і Байран, Колас і «Калевала», Быкаў і Хемінгуэй роўныя. Піша Якуб Лапатка.**

Апошнім часам усе, хто хоча — ад нудыстаў да канструктывістаў, — як дамовіўшыся, дзяўбуць беларускую літаратуру штомоцы: яна і бяззубая, і дэструктыўная, і правінцыйная.

У чым заключаецца бяззубасць і дэструктыўнасць творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Янкі Брыля, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Някляева, Ніла Гілевіча, Уладзіміра Арлова ды іншых пісьменнікаў і паэтаў? Уцямных тлумачэнняў няма. Таму адкінем развазанні пра бяззубасць і дэструктыўнасць як простае эпатажна-палітычнае глупства.

Абвінавачванне ў правінцыйнасці — гэта ўжо болей сур'ёзна. На першы погляд. А на другі — ніхто не ведае толкам, што такое правінцыйнасць. Проста гэта довад, каб вынесці прысуд. Але ў справядлівасці прысуду беларускай літаратуры ўзнікаюць пытанні.

Чаму «Шыльёнскі вязень» англійскага Байрана — гэта ўзнёсла, рамантычна і, скажам так, агульначалавеча, а «Курган» нашага Купалы — гэта правінцыйна і ў агульначалавечую скарбонку не падыходзіць?

І чым шэкспіраўскі каўбой Атэла лепшы за купалаўскага Машэку з «Магілы льва»? (Чаму каўбой? Каўбоі з амерыканскіх вестэрнаў спачатку стралялі, а потым разбіраліся. У той жа манеры дзейнічае і «высакародны мурын»: задушыў ні ў чым не вінаватую жонку, а потым пачаў разбірацца. Машэка ж вар'яваўся, дакладна ведаючы, што каханая памяняла яго, беднага плытагона, на багатага баярына.)

А звада Мантэкаў з Капулеці — узор міжсемейных адносін? А карлікавая Верона (у тыя часы нешта роўнавялікае сучасным Расонам ці Бялынічам) — цэнтр сусветнай культуры і высокай маралі? Герцаг веронскі ацаніў маральнасць «высакародных» бацькоў: «Чума на вашыя дамы абодва!»

Цяжкая артылерыя: у беларусаў няма народнага эпасу, які мог бы ўзняць іх літаратуру на агульначалавечыя вышыні! Што праўда, то праўда. Няма ў беларусаў смертазабойнага эпасу з бязлітаснымі, нялюдска станоўчымі пратаганістамі. Менавіта пратаганістамі, бо назваць іх «героямі» не паварочваецца язык. Страшэнна далёкія яны ад нашага народа. Нам бліжэйшая фінская «Калевала» з яе лясными вясковымі героямі. Там мы сустрэнем усё, што добра вядома і блізка: і мудрага старога Вяйнямёйнена, і помслівага паўшабэлка Еўкахайнена, і нахабнага балбатуна Лемінкяйнена, і вясковага каваля-майстра на ўсе рукі Ілмарынена.

І ніводнага з герояў «Калевалы» нельга залічыць у рыцары без страху і заганы, не. Гэта звычайныя і зразумелыя людзі. Стары Вяйнямёнен распускае хвост перад кожнай дзеўкай і не заўсёды робіць мудрыя ўчынкі, што выклікае нават, пратакольна кажучы, чалавечыя ахвяры. Лемінкяйнен заўжды гатовы распачаць бойку на гулянцы, куды яго зусім не запрашалі, і нарываецца: яго забіваюць. І толькі матчына любоў вяртае задзіраку з царства мёртвых. А жонка каваля Ілмарынена — проста ўзор вясковай злашкоднай кабеты, гатовай напаскудзіць чалавеку проста так, па дурасці натуры.

Я люблю гэтых герояў таму, што яны жывыя, блізкія і зразумелыя мне ў сваіх дзеях і ўчынках. Яшчэ на подступах да грунтоўнага перакладу «Калевалы» я адчуваў нейкае дзіўнае пачуццё дэжа вю. Дзе я гэта чуў? І толькі перачытваючы «Новую зямлю» Якуба Коласа, скеміў: во яно! Вясковае жыццё, вясковыя людзі, святы і абрады, маленькія людскія радасці — усё гэта было так падобна, так блізка да «Калевалы»!

Фіны шануюць сваіх сівалапых герояў, сваю народную паэму. У календары нават ёсць адмысловы Дзень Калевалы, 28 лютага. Па ўсёй Фінляндыі ўздымаюцца дзяржаўныя сцягі ў дварах, над пад'ездамі дамоў, над установамі.

Нашу «Новую зямлю» расцягалі на прымаўкі, кожны ведае чароўныя словы «Мой родны кут, як ты мне мілы!», але паставіць яе ў адзін шэраг з «Калевалай» ці кіргізскім «Манасам» ніводзін літаратуразнаўца не адважыўся. А яна ні па вобразнасці, ні па мастацкіх сродках не саступае найлепшым узорам любой літаратуры. Гэта жывая беларуская мова, інтанацыі якой зараз не пачуеш ні па беларускім дзяржаўным радыё, ні па «варожых галасах».

На Беларусі святкуюцца шматлікія Дні: ад Дня банкаўскіх працаўнікоў да Дня каваля, а вось дня для сапраўды НАРОДНАЙ паэмы у календары не знайшлося. А усё таму, што ёй, як і іншым творам, «шыюць» правінцыйнасць.

Усе без выключэння фіны абавязкова ведаюць гімн «Наш край», народную эпічную паэму «Калевала» і раман Вяйнё Ліны «Невядомы салдат». І ніводнаму фіну вы не зможаце давесці, што Хемінгуэй ці Рэмарк пісалі пра вайну лепей, чым іх Вяйнё Ліна, хай сабе і не сусветна вядомы. Ніхто не будзе спрачацца, што Пушкін, Гётэ ці Байран — вялікія паэты. Яны сабе хай будуць. А для іх Эйна Лейна, Міка Валтары з Юхані Ахам не меней вялікія. І ніякіх комплексаў. Ніякага адмаўлення каштоўнасці сваёй літаратуры для свайго народа.

У нас: Быкаў і Хэмінгуэй роўныя? Кіньце! Куды яму! А чаму, уласна кажучы? Умяне ёсць толькі адзін адказ: безнадзейная правінцыйнасць у галовах «знаўцаў», а не ў літаратуры. Нам столькі год даводзілі, што беларусы — нацыя вясковая, несамадастатковая, правінцыйная. Гэтая лухта і прыжылася ў галовах людзей, як хваробная бацыла, разбураючы нацыянальную свядомасць і годнасць. Прыжылася настолькі, што чужаземныя «цветики степные» пустазельна, як нейкія пачварныя «кветкі зла», узбуялі так, што забіваюць беларускі «цвяток радзімы васілька».

**Якуб Лапатка**

Нар. у 1944 у вёсцы Аўсюкова (Расонскі раён). Скончыў іспанскі факультэт Мінскага інстытута замежных моваў. Дваццаць гадоў працаваў настаўнікам у Наваполацку. Цяпер жыве ў Хельсінкі (Фінляндыя). Займаецца перакладам фінскай літаратуры на беларускую мову. Аўтар поўнага перакладу фінскага нацыянальнага эпасу «Калевала».




**Белая яблыня грому**

**23 сакавіка** Лявон Вольскі прэзентуе ў **Купалаўскім тэатры** сольны альбом «Белая яблыня грому» на вершы XIX—XX стагоддзяў: ад Яна Чачота, Адама Міцкевіча, Францішка Багушэвіча праз Максіма Багдановіча, Янку Купалу, Якуба Коласа да Максіма Танка, Пімена Панчанкі і Рыгора Барадуліна. **Пачатак а 19-й.**

## КАНЦЭРТЫ

**Фолк-рок вясна — 2010**

**14 сакавіка а 18-й у Jolly Roger Cafe (вул.Талбухіна, 4 (3 паверх)** — «Фолк-рок вясна — 2010». Бярuць удзел **«Рокаш», Rosy, «Омут», «Кашлаты вох»**.

**Testamentum Terrae у Віцебску**

Канцэрт старадаўняй беларускай музыкі ад гурта Testamentum Terrae адбудзецца **ў Віцебску 20 сакавіка**. Канцэрт пройдзе **ў бітлз-клубе «Паддашак» (вул.Кастрычніцкая, 11, уваход праз абутковую майстэрню) і пачнецца а 20-й.**

**Песні філаматаў у Доме Ваньковічаў**

**14 сакавіка а 15-й у музычнай гасцёўні Дома Ваньковічаў (вул. Інтэрнацыянальная, 33а)** адбудзецца канцэрт «Хай радасць з вачэй нашых бліснe...». У выкананні Аляксея Жбанова і ягоных сяброў будуць гучаць песні філаматаў і філарэтаў, студэнтаў Віленскага універсітэта пачатку XIX стагоддзя, у перакладах К.Цвіркі, В.Сёмухі, А.Жбанова.

**Камоцкі ў Купалаўскім**

**19 сакавіка а 19-й на Малой сцэне Купалаўскага тэатра** Алесь Камоцкі прадстаўляе канцэртную праграму «Мітусьня каляровых дзён». Спосаб набыцця квіткоў толькі адзін: патэлефанаваць (29) 253-25-04 і набыць. І ніяк інакш.

**«Ляпіс» у Гомелі**

**12 сакавіка ў Гомельскім цэнтры культуры** — канцэрт «Ляпіса Трубяцкога». Гурт прадставіць альбом «Культпрасвет». **Пачатак а 19-й.**

**Метал-фэст у «Рэактары»**

**12 сакавіка ў мінскім клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** метал-фэст Metalfront.org Music Awards-2009. **Пачатак а 17-й.**

**Port Mone**

**13 сакавіка на сцэне Тэатра беларускай драматургіі (вул.Крапоткіна, 44)** пройдзе прэзентацыя беларускага выдання дэбютнага альбома гурта Port Mone «DiP». **Пачатак а 19-й.**

**Фолк-фестываль у «Добрых мыслях»**

**13 сакавіка ў кавярні «Добрыя мыслі» (вул. Магілёўская, 12)** адбудзецца невялікі фестываль беларускага і замежнага фальклору. **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ



**Ірландскія танцы**

**16—18 сакавіка ў Новым тэатры (вул. Чайкіной, 16)** пройдзе фестываль «Ірландскія танцы». Гледачоў чакаюць канцэрт ірландскай музыкі і танца з удзелам гуртоў **Ceilidh ceol, Crouse reel, Gloria, Green Hills, Phoenix**. У дзень святога Патрыка выступяць ансамблі ірландскага танца з Ірландыі і Беларусі.

**Беларускія танцы ў Мінску — шточацвер**

**Шточацвер ад 19-й да 23-й у кавярні «Жар-птушка»** адбываюцца беларускія вечарынкі. Уваход каштуе 6 тыс. рублёў з носа. Звычайна збіраецца каля 70—80 чалавек. Наведваюць танцы пераважна юнакі і дзяўчаты: студэнты і працоўныя. Але прыходзяць часамі, у ранейшыя гадзіны, і сем'і з дзецьмі-школьнікамі, якія паміж танцамі тусуюцца ля гульнявых аўтаматаў. Для дзяцей уваход нічога не каштуе. На танцах вучаць ойру, падэспан, полькі. Большасць наведнікаў — беларускамоўныя. **Кавярня месціцца ў парку Горкага, ля вадаспаду.** Даезд да метро «Плошча Перамогі» ці аўтобусам нумар 100 па праспекце. Або трамваямі да прыпынку «Парк Горкага».

**Эдуард Акулін і Дранько-Майсюк**

**10 сакавіка** Эдуард Акулін і Леанід Дранько-Майсюк ладзяць сустрэчу з чытачамі **ў Абласной бібліятэцы імя Пушкіна (вул.Гікала, 4). 11 сакавіка** пісьменнікі правядуць творчую сустрэчу са студэнтамі **Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва (вул. Ціміразева, 65А). Пачатак аб 11-й.** Уваход вольны.

**Святая праўда ды іншыя казкі**

Прэзентацыя зборніка лаўрэатаў конкурсу маладых літаратараў імя Карласа Шэрмана «Святая праўда ды іншыя казкі» пройдзе **15 сакавіка ў кавярні «Лісіная нара» (вул. Каліноўскага, 32).** Сярод выступоўцаў: Андрэй Хадановіч, Віталь Рыжкоў, Марыйка Мартысевіч, Анка Упала, Павел Анціпаў... Спіс увесь час папаўняецца. **Пачатак а 19-й.**

**Творчы вечар Рагнеда Малахоўскага**

**12 сакавіка а 18-й у бібліятэцы Цёткі (вул.Талбухіна, 12а)** — творчы вечар паэта, фатографа, музыкі Рагнеда Малахоўскага пад назвай «Музы». Уваход вольны.

**Замак з крапівы**

**16 сакавіка ў Музеі беларускай літаратуры (вул. Багдановіча, 13)** — прэзентацыя рамана Змітра Вішнёва «Замак, пабудаваны з крапівы». Бяруць удзел: Адам Глобус, Альгерд Бахарэвіч, Барыс Пятровіч, Андрэ Бём, Пятро Васючэнка, Вольга Гапеева. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Гістарычны музей: экспануецца ўпершыню**

**У Гістарычным музеі да 29 мая** працуе выстава «Экспануецца ўпершыню», якая знаёміць наведнікаў з новымі набыткамі музея.

**Віктар Альшэўскі**

**11 сакавіка а 17-й у Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** адкрываецца выстава жывапісу Віктара Альшэўскага «Фрагменты Вавілонскай вежы». Гэта працяг выставачнага праекта «Легенды нашай цывілізацыі». Выстава працуе **да 22 красавіка.**

**Стан**

**У галерэі «Свет фота» (вул.Прытыцкага, 10а)** працуе фотавыстава Наталлі Яўмененкі «Стан». Перад вамі — своеасаблівы расповед пра ўзаемасувязь месца мадэлі і фатографа.

**Жывапіс Валяр'яны Жоўтак**

**У Мастацкім музеі да 29 сакавіка** працуе выстава жывапісу Валяр'яны Жоўтак «Кола часу». Мастачка працавала ў розных жанрах, але найбольш вядомыя яе нацюрморты.

**Цёплае дрэва — халодны метал**

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 21 сакавіка** працуе выстава разьбяра і чаканшчыка Юрыя Адамовіча «Цёплае дрэва — халодны метал». Работы выкананыя ў мяшанай тэхніцы, што яднае ў сабе разьбу па дрэве і халодную, ручную, прарэзаную, аб'ёмную чаканку.

**Тэатр юнага гледача і яго гісторыя**

Чым жыў тэатр дзесяцігоддзі таму? Якімі афішамі заклікаў да сябе дзетак, а таксама іх бацькоў? Пра ўсё гэта можна даведацца на выставе, прысвечанай 55-годдзю творчай дзейнасці Тэатра юнага гледача, якая працуе **да 31 сакавіка ў «Гасцёўні Уладзіслава Галубка» (вул.Старавіленская, 14).**

**Кветкавы баль**

**У Музеі Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а) да 28 сакавіка** працуе выстава фларыста Дзіны Шымук «Кветкавы баль». Дзіна Шымук — першы беларускі фларыст, яна працуе ў тэхніцы ашыбана. Гэта жывапіс раслінамі. Мастак збірае і засушвае кветкі, зёлкі, лісце, а пасля стварае з іх творы.

**Выстава віцебскіх мастакоў**

**У Палацы мастацтва (вул. Казлова, 3) да 14 сакавіка** працуе выстава віцебскіх мастакоў «Фактура». **Тамсама да 19 сакавіка** працуе выстава «Мастацтва эстампа». Эстамп — мастацкая графіка (аформ, літаграфія, гравюра). Выстава эстампа не праводзілася ўжо больш за дзесяць гадоў. Аснову экспазіцыі складаюць работы, створаныя на базе Эксперыментальнай творчай майстэрні эстампа Саюза мастакоў.

**Выстава Аляксея Кокцева**

**У мастацкай галерэі «Палац мастацтва» да 19 сакавіка** працуе персанальная выстава Аляксея Кокцева, прымеркаваная да 65-годдзя мастака.

**Стан розуму**

**Да 30 сакавіка ў галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)** працуе выстава інсталяцый State of Mind (Стан Розуму) Анікі Карлсан Рыксан і Анны Віёлы Хальберг (Швецыя).

## ТЭАТРЫ

**11 сакавіка**
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**12 сакавіка**
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Тэатр лялек** — «Дом, які пабудаваў Свіфт»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»

**13 сакавіка**
**Тэатр лялек** — «Жахлівы спадар Ау»
**Тэатр юнага гледача** — «Каралеўства крывых люстэркаў»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»

**14 сакавіка**
**Тэатр лялек** — «Прыгоды Піні-Піна»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр імя Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сублімацыя кахання»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

**15 сакавіка**
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»

**16 сакавіка**
**Тэатр лялек** — «Піпі-Доўгаяпанчоха»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Тэатр юнага гледача** — «Шчаўкунок»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**17 сакавіка**
**Тэатр лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»

**18 сакавіка**
**Тэатр лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**19 сакавіка**
**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго горада»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр імя Горкага** — «Нінaчка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»

**20 сакавіка**
**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»
**Тэатр імя Горкага** — «Каштанка»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

**21 сакавіка**
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»

## ГОД ШАПЭНА



**Ліцвінская мелодыя Шапэна**

**10 сакавіка ў Малой зале філармоніі імя Шырмы (пр. Незалежнасці, 50)** — канцэрт «Ліцвінская мелодыя Шапэна», прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння музыкі. Іграе ансамбль «Класік-Авангард». **Пачатак а 19-й.**

**Натхненне**

**12 сакавіка ў Малой зале філармоніі (пр.Незалежнасці, 50) а 19-й** пачнецца вечар фартэпіяннай музыкі «Натхненне», прысвечаны 200-годдзю з дня народзінаў Ф.Шапэна.

**Jazz Chopin**

**24 сакавіка ў Вялікай канцэртнай зале Філармоніі (пр.Незалежнасці, 50) а 19-й** пачнецца канцэрт JAZZ CHOPIN у рамках святкавання года Фрыдэрыка Шапэна. Выканаўцы: камерны аркестр AUKSO.




## КІНО

# Антыўкраінскі фільм




**Мы з будучыні-2** (Мы из будущего-2)

Расія, 2010, каляровы, 98 хв.

**Рэжысёры:** Аляксандр Самахвалаў, Барыс Растоў

**Ролі выконваюць:** Ігар Пятрэнка, Кацярына Клімава, Уладзімір Яглыч, Аляксей Барабаш, Зміцер Ступка, Іван Краско

**Жанр:** Ваенна-фантастычны фільм

**Адзнака:** 3 (з 10)

Былыя аматары СС, а цяпер заўзятыя расійскія патрыёты Борман і Чэрап зноўку трапляюць у часы Другой сусветнай. Кампанію ім цяпер складаюць два ўкраінцы — Таран і Шэры.

Вораг — празаходняя Украіна. І вось ужо байцы УПА, як у старых савецкіх фільмах эсэсаўцы, радасна мардуюць жанчын. Ільецца кроў. Носяцца танкі. Гучыць украінскі рок. Ён, бадай, адзіная вартасць стужкі.

**Андрэй Расінскі**

# «Заплаці МТС 290 тысяч і развядзі Life:) на мільёны!»

Байнэт знайшоў схему атрымання шматтысячных ці нават мільённых бонусных грошай на рахунак ад аператара Life:).

Аператар мабільнай сувязі МТС прэзентаваў новы тарыфны план — «Абсалют». Яго сутнасць — неабмежаваныя званкі па ўсёй Беларусі за 290 тысяч рублёў за месяц.

Творчыя наведвальнікі сайта Onliner.by падышлі да гэтай навіны з іншага боку.

Як вядома, абаненты іншага аператара, Life:), атрымліваюць ад кампаніі бонус у памеры 200 рублёў за званкі на іх нумары ад абанентаў іншых аператараў. То бок, калі табе, «лайфаўцу», патэлефануе сябар-«вэлкомшчык», то ты атрымаеш ад Life:) дадатковыя грошы на рахунак. Іх нельга забраць наяўнымі, яны «згараюць» у канцы месяца, але іх можна траціць на званкі ці смс-кі. Такім чынам, кожны ахвотны карыстальнік «Абсалюта» ад МТС можа неабмежаваную колькасць разоў бясплатна званіць на Life:) і штучна павялічваць чужы бонусны рахунак.

«Хочаш 100 000 бонуса? Заплаці мне 70 000 альбо 50 000 і пакінь тэлефон на размове на ноч. Новая рэкламная акцыя!» — смяюцца ў інтэрнэце. Схема ўмоўная. У мінусе застанецца і МТС — яму давядзецца раскашэліцца на міжсеткавыя званкі, за якія аператары плацяць адзін аднаму. Але «кампенсацыя» у памеры 290 тысяч ад абанентаў не зробіць МТС нашмат бяднейшым.

Life:) вырашыў адказаць маўчаннем. Вось як каментуе сітуацыю прэс-сакратарка кампаніі Таісія Пастухова: «Наўрад ці «Лайф» будзе ў пройгрышы ад таго, што нейкі іншы аператар вывеў новы тарыфны план. Мы заўсёды знойдзем чым адказаць. Калі згубім у адным месцы — заробім у іншым».



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Ягор Марціновіч**

ТЭХНАЛОГІІ

# Новая рэвалюцыя ў войнах

Вайна ў 1991-м годзе ў Персідскім заліве была паваротам у ваеннай справе. Вораг быў для салдатаў Хусэйна нябачным і недасяжным. Амерыканскія ракеты знаходзілі цэлі з дакладнасцю да метра. Спадарожнікі і самалёты сачылі за іракскімі манеўрамі днём і ноччу. Ашаламляльную перавагу меў адзін з бакоў. Параўнаць яе можна толькі з перавагай англічан у вайне з дэрвішамі над Нілам, калі тыя з кулямётаў «Максім» расстралялі за некалькі гадзін 50-тысячную армію, а самі страцілі 48 жаўнераў.

Першая вайна ў заліве была цудоўнай ілюстрацыяй тэхнагеннай цывілізацыі, калі тэрмін цывілізацыя тут увогуле прыдатны. Тэлебачанне паказвала вайну амаль у жывую. Амерыканскае камандаванне, дзякуючы запісам і трансляцыям з беспілотнікаў, у рэжыме рэальнага часу сачыла за развіццём падзей на тэрыторыі ваенных дзеянняў.

Высланы на самым пачатку вайны амерыканскі F-117 Stealth знішчыў камунікацыйны цэнтр іракскай тэлефоннай сеткі ў цэнтры Багдада. Знішчэнне тэлефонных кабеляў пазбавіла камандныя цэнтры іракскага войска самага важнага спосабу сувязі з часцямі. Ракеты Tomahawk з дапамогай стужак з вуглевадароднага валакна паралізавалі асноўныя фрагменты энергетычнай сеткі краіны. Верталёты выстрэльвалі снарады з рэчывам, якое, распыліўшыся ў паветры, зрабіла немагчымай працу радараў і супрацьпаветранай абароны. Іракская армія была аглушаная і аслепленая.



Ці насамрэч амерыканцам больш непатрэбныя жаўнеры? Натуральна, што не. Амерыканцы валодаюць некалькімі арміямі — новай інфармацыйнай і традыцыйнай. У Іраку адначасова ішлі дзве розныя вайны. Адна з выкарыстаннем найсучаснейшых тэхналогій — вайна інфармацыйнай эры, другая — традыцыйная —з выкарыстаннем вялізнага войска.

З амерыканскага боку ў вайне ўдзельнічала больш за мільён чалавек — жаўнераў і абслугоўваючага персаналу. Па-за тэхналагічнымі інавацыямі свой вынік мелі і традыцыйныя метады. Канчатковую перамогу гарантаваў толькі масавы ўдар наземнымі сіламі. Нават пры мінімальным адпоры іракскага боку краіну з яе вялікімі тэрыторыямі проста трэба было заняць.

У вайсковай галіне канца гісторыі не бывае. Вынаходніцтвы ашаламляюць сучаснікаў. Аднак на кожную новую зброю знаходзіцца адказ — у выглядзе змены тактыкі альбо чарговай тэхналагічнай інавацыі.

Калі НАТО выйграла вайну ў Косава, шмат гаварылася пра новую эру ў ваенным сэнсе. Яна не страціла ніводнага салдата, а лічба ахвяраў з сербскага боку таксама не перавышала некальскі соцень. Аднак прыклады з Ірака і Афганістана паказалі, што канфлікты і далей цягнуцца доўга, і льецца шмат крыві. Як, напрыклад, змагацца з тэрарызмам?

Войны і надалей забіваюць. А яшчэ яны часам не прыносяць перамог.

**Алесь Пілецкі**

СЯМ'Я

## Калі прыходзіць сямейнае шчасце?

Роўна праз 2 гады, 11 месяцаў і 8 дзён пасля вяселля

ў сямейных пар наступае гармонія. Брытанскія навукоўцы прыйшлі да такой высновы, апытаўшы чатыры тысячы чалавек.

Муж і жонка прызвычайваюцца адзін да аднаго, у тым ліку да таго, што раней іх раздражняла. Акрамя таго, да гэтага моманту маладая сям'я вызначаецца з планамі на будучыню. Таксама пара зазвычай ужо знаходзіць утульнае для абаіх жыллё.

Даследчыкі таксама сцвярджаюць, што сэксуальнае жыццё пары становіцца гарманічным праз 2 гады і 4 месяцы пасля вяселля. Да гэтага моманту муж і жонка ўжо дастаткова добра ведаюць адзін аднаго і разнявольваюцца.

**Наста Шамрэй**

ЗДАРОЎЕ

## У 42% выпадкаў прычына мужчынскай бясплоднасці — варыкоз, і гэта лечыцца

Пра прычыны мужчынскай бясплоднасці вядома мала, хоць распаўсюджана яна гэтак жа, як бясплоднасць у жанчын. Цяпер навукоўцы засяродзіліся на пошуку генетычных дэфектаў, якія могуць быць прычынай бясплоддзя. Даследаванні вучоных з Медыцынскага каледжа ў Х'юстане сведчаць, што ген, звязаны з мужчынскай бясплоднасцю, таксама звязаны з ракам тоўстай кішкі і яечак.

Самая частая прычына бясплоднасці мужчын — каля 42% выпадкаў — варыкоз машонкі, або варыкацэле, вылечная хвароба, якая можа прывесці да зніжэння выпрацоўкі спермы.

Іншай распаўсюджанай прычынай бясплоднасці з'яўляецца непраходнасць у мужчынскіх палавых органах, выкліканая, сярод іншага, прыроджанай хваробай або інфекцыяй.

Гарманальныя праблемы, якія некалькі гадоў таму даследчыкі лічылі адной з асноўных прычын бясплоднасці, дыягнастуюць толькі ў 1% выпадкаў.

**КаМ**

ВЫХАВАННЕ

## Калі дзіця позна папаўзло — яму будзе цяжэй у садку

Калі дзіця не навучылася поўзаць да 9 месяцаў, у яго будуць праблемы ў школе, лічаць фізіёлагі з Лонданскага ўніверсітэта.

Даследчыкі назіралі за 15 000 дзяцей на працягу першых 5 гадоў жыцця. Простыя тэсты дапамаглі выявіць сувязь паміж тым, як хутка развівалася дзіця, і яго паспяховасцю і паводзінамі ў школе. Уменне выконваць тыя ці іншыя дзеянні, звязаныя з развіццём мускулаў і дробнай маторыкі.

96% дзяцей у 9-месячным узросце маглі сядзець без падтрымкі, 92% умелі поўзаць, 69% — стаяць пры дапамозе дарослых, 4% ужо рабілі першыя крокі, 99% маглі схапіць цацку, 95% — перакладаць яе з рукі ў руку. У цэлым каля 10% дзяцей адставалі ў развіцці ад аднагодкаў і ва ўзросце 5 гадоў мелі праблемы ў садку.

Навукоўцы падкрэслілі, што ўсе дзеці розныя і ў кожнага дзіцяці свой тэмп развіцця, але пры гэтым бацькам варта ведаць загадзя аб імаверных праблемах — каб паспець выправіць сітуацыю.

**НШ**

ТЭХНІКА

## Вынайдзена прылада, якая імгненна ачышчае рукі ад мікробаў

Дактары ў бальніцах штодзень сто разоў мыюць рукі з мылам. На гэты працэс сыходзіць хвіліна часу, а ў такіх установах часта лік ідзе на секунды. Каб дактары змаглі ашчаджаць свой час, навукоўцы і вынайшлі незвычайны «мыйнік».

Прылада даволі простая — дастаткова ўсунуць далоні ў чорную каробку, якая «выкупае» іх ў плазме. Гэта той самы газ, што знаходзіцца ў неонавых шыльдах і тэлевізійных экранах. Але гэты тып плазмы пакаёвай тэмпературы прызначаны для знішчэння мікробаў, бактэрыяў і вірусаў.

На дэзінфікцыю ідзе 4 секунды, мікробы знішчаюцца нават пад пазногцямі. А ступні нават у шкарпэтках — за 25 секунд. Цана на навінку не перавышае $100.

**ЯМ**

**Сапраўдная беларуская кухня**

### Кавалак бараніны са смятанным соусам

1 кавалак бараніны, 200 г саланіны, соль, 1 шклянка смятаны

Кавалак бараніны старанна ачысціць ад тлушчу, плевак і жылак так, каб засталося толькі чыстае мяса. Адбіць, пасаліць, нашпігаваць саланінай і спячы на адкрытым агні на ражне або ў печцы, паліваючы час ад часу смятанай. Падаць з падлівай, якая ўтварылася падчас выпякання.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

**Прыватныя абвесткі**

КАНТАКТЫ

**Адгукніцеся, калі ласка, спн. А.Нікалаева,** аўтарка тэксту «Некаторыя пытанні транслітарацыі...». Т.: (29) 761–88–84, (44) 743–78–63, z_sauka@yahoo.com.

КНІГІ

**5-ы выпуск факсімільнага выдання** «першае беларускае газэты з рысункамі» — газеты «Наша Ніва» за 1912—1915, 1920 гады можна знайсці праз інтэрнэт–кнігарню prastora.by. Тамсама — сотні іншых беларускіх кніг і дыскаў.

НАБУДУ

**Набуду фільм «Сівая легенда»,** рэжысёр Богдан Парэмба, 1991 г. Т.: (029) 179–04–38.

**Набуду кнігі** Васіля Супруна. Т.: (029) 383–00–06.

ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем** у падарожжа ва Украіну «Падольскія фартэцыі» 26—29 сакавіка па маршруце: Камянец–Падольскі—Хоцін—Меджыбож. 7—11 красавіка — вандроўка «Тры Сталіцы: Будапешт — Браціслава — Вена». Т.: (017) 292–54–58, (029) 622–57–20, (02) 110–19–28, (029) 509–12–16.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Газетка дзеткам



Кавалю Марціне,
Падкуй ты мне свінню,
Бо зіма падходзіць,
Свіння боса ходзіць.

Кавалю Марціне,
Падкуй ты мне кота,
А калі не ўмееш —
Прывяжы да плота.

**З народнага**



PHOTO.BYMEDIA.NET



**Бігборд на вуліцы Познані, усталяваны на замову руху «У абарону жыцця», нагадвае палякам, што першым, хто дазволіў аборты ў Польшчы, быў Адольф Гітлер.**


**У Паўночнай Карэі стварылі ўласную аперацыйную сістэму для камп'ютараў. Яна называецца Red Star, і замест кнопкі «Пуск» у ёй — чырвоная зорка.**


PHOTO.BYMEDIA.NET
**Міліцыя не толькі садзіць. Работнікі МУС выпускаюць галубоў падчас цырымоніі на Дзень міліцыі.**

## АНЕКДОТЫ

* * *

Што такое ўніверсальны падарунак? Гэта такі падарунак, які можна падараваць 23 лютага і назад перадарыць 8 сакавіка.

* * *

Хочаце мець спартыўнае загарэлае цела? Вандраваць па ўсім свеце разам са шматлікімі сябрамі, такімі ж спартыўнымі і загарэлымі? Галернае рабства — ваш выбар!

* * *

Сапраўдная займальная арыфметыка пачынаецца тады, калі да палучкі яшчэ цэлы тыдзень, а грошай засталося роўна на тры дні.

* * *

— А чаго суседка так перажывае? Ну, выпіў муж на 8 сакавіка, дык жа ён і духі ёй падарыў...

— Ты нічога не зразумела: яе муж выпіў духі, якія падарыў ёй на 8 сакавіка.

* * *

Крык адчаю гэтай зімы:

— Трэці раз за дзень машыну адкопваю. І зноў не мая!

* * *

Сантэхнік кажа гаспадыні, што плача ў затопленай кухні:

— Перастаньце. Бачыце, і так колькі вады кругом.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

***

Проці цячэння вады
Зможа толькі жывое паплыць,
Хвалі ж ракі заўсягды
Цягнуць тое, што скончыла жыць.

**Максім Багдановіч. «НН» №10. 1910**

**HERstory замест HIStory**

Я гляджу на фота пачатку XX ст. Жанчыны пікетуюць Белы дом, патрабуючы права голасу. Пацешна, гэта было так нядаўна…Жанчынам было забаронена выступаць у публічных месцах, друкаваць допісы ў цэнтральных газетах, зарабляць і мець у сваім распараджэнні ўласнасць.

Многія вялікія людзі свету назвалі рух за жаночыя правы самай прагрэсіўнай з'явай мінулага стагоддзя. Не навукова-тэхнічная рэвалюцыя, а разнявволенне скутых зрушыла твар чалавецтва.

**Святлана Курс. «НН» №10. 2000**

# РГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны»

арганізуе

**бясплатныя заняткі па беларускай мове і гісторыі для школьнікаў 7-х — 9-х класаў**

Заняткі праводзяць вядомыя педагогі, кандыдаты навук, выдатнікі адукацыі Беларусі.

**Арганізацыйны сход — 17.03.2010 г. (серада) у памяшканні ТБМ (Мінск, вул. Румянцава, 13, каля ст. метро «Плошча Перамогі»).** Вучні 7-х—8-х класаў збіраюцца ў **16.30**, вучні 9-х класаў — **у 17.15**. Даведкі праз тэл.: 284-85-11.



COMICS.BY.LIVEJOURNAL.COM

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6320.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 09.03.2010.
Замова № 1142.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 10010